## АБМЕРКАВАНЫ БАЛАНСЫ ПАСТАВАК НАФТЫ І НАФТАПРАДУКТАЎ

**Сустрэча першага намесніка прэм'ер-міністра Беларусі Уладзіміра Сямашкі і намесніка старшыні ўрада Расіі Аркадзя Дварковіча адбылася ўчора ў Маскве, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе пасольства Беларусі ў Расіі.**

У ходзе сустрэчы абмяркоўваліся пытанні, звязаныя з рэалізацыяй важнейшых праектаў прамысловай інтэграцыі, падпісаннем балансаў пастаўкі нафты і нафтапрадуктаў, а таксама закрануты тэмы паставак беларускіх прадуктаў харчавання ў Расійскую Федэрацыю.

Дадзены даручэнні зацікаўленым у прадаўжэнні кансультацый. Работа будзе весціся ў адпаведнасці з устаноўленымі планамі-графікамі.

■ Парламенцкі дзённік

# ВЫСЛУХАЦЬ І ПАЧУЦЬ

**Учора ў Бабруйску прайшло пашыранае пасяджэнне Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па эканамічнай палітыцы, на якім абмяркоўваліся законапраекты, звязаныя з развіццём бізнесу ў Беларусі.**



Размова ідзе пра два дакументы — папраўкі ў закон аб гаспадарчых таварыствах і законапраект аб прыватызацыі, якія былі прыняты ў першым чытанні на вясновай сесіі пакетам і якія выклікалі боязь бізнес-суполкі, што заканадаўчыя навацыі негатыўна адаб'юцца на інвестыцыйнай прывабнасці беларускіх акцыянерных таварыстваў.

Бізнес-саюз прадпрымальнікаў і наймальнікаў імя Макса Куняўскага накіраваў у парламент ліст са сваімі меркаваннямі і прапановамі адносна плануемых змен у заканадаўстве. У ліпені парламенцкая камісія, якая рыхтуе законапраекты да другога чытання, удзельнічала ў пасяджэнні Рэспубліканскага клуба дырэктараў пры Бізнес-саюзе. Цяпер дэпутаты разам з распрацоўшчыкамі закона наведалі ў Бабруйску тры прадпрыемствы, якія маюць розныя долі дзяржаўнай уласнасці і розную колькасць мінарытарных (пакет акцый якіх не дазваляе напрамую ўдзельнічаць у кіраванні кампаніяй) і мажарытарных (буйных) акцыянераў: Бабруйскую кандытарскую фабрыку «Чырвоны харчавік», ЗАТ «Бабруйскмэбля» і АТ «Бабруйскі машынабудаўнічы завод».

— Асноўная наша мэта — выслухаць і пачуць у Бабруйску людзей, якія практычна звязаны з двума гэтымі заканадаўчымі актамі, — сказаў **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па эканамічнай палітыцы Віктар ВАЛЮШЫЦКІ** *(на фота)*. — Я хацеў бы запэўніць і мінарытарных акцыянераў, і прадстаўнікоў бізнес-суполкі, што любыя рашэнні, якія будуць прыняты Палатай прадстаўнікоў, дасканала ўзважаныя і глыбока прааналізаваныя. Мы праводзім аналітычную працу сумесна з урадам і іншымі дзяржаўнымі органамі па ўсіх спрэчных момантах.

Да другога чытання законапраекты «Аб унясенні дапаўненняў і змяненняў у некаторыя законы Рэспублікі Беларусь па пытаннях гаспадарчых таварыстваў» і «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб прыватызацыі дзяржаўнай маёмасці і пераўтварэнні дзяржаўных унітарных прадпрыемстваў у адкрытыя акцыянерныя таварыствы» плануецца вынесці ў лістападзе.

Віктар Валюшыцкі падкрэсліў, што рабочая група, якая працуе над дакументамі, адкрытая для ўнясення прапаноў у законапраекты. Дэпутат заўважыў таксама, што шэраг палажэнняў, якія змяшчаюць праекты, чакаюць бізнесмены. Упершыню ў законе прапануецца замацаваць нормы, якія прадугледжваюць стварэнне гаспадарчага таварыства адным удзельнікам, парадак прыняцця рашэння аб заснаванні такога таварыства, урэгуляванне яго дзейнасці і пытанні кіравання ў ім.

— Адна з самых важных навацый — артыкул, які вызначае прадмет акцыянернага пагаднення і рэгулюе парадак яго заключэння і выканання, — лічыць Віктар Валюшыцкі. — Гэта вельмі прагрэсіўная норма, якая здымае многія пытанні ў дачыненні да ўладальніцкага нагляду, які выклікаў шуміху ў прэсе. Акцыянернае пагадненне працуе і ў актыў мажарытарных, і ў актыў мінарытарных акцыянераў.

Законапраект аб змяненнях у закон аб прыватызацыі дзяржаўнай маёмасці прадугледжвае дадатковае рэгуляванне асаблівасцяў прававога палажэння адкрытых акцыянерных таварыстваў, якія былі створаны менавіта ў працэсе пераўтварэння дзяржаўных унітарных прадпрыемстваў, падкрэслівае парламентарый. «Ён накіраваны на ўдасканаленне заканадаўства ў сферы ўладальніцкага нагляду, а таксама на абарону правоў і законных інтарэсаў грамадзян Беларусі, уключаючы мінарытарных акцыянераў такіх таварыстваў, а таксама на абарону мажарытарных акцыянераў, — сказаў дэпутат. — У праектах заканадаўчых актаў закладзены празрысты і дакладны механізм, які могуць рэалізоўваць акцыянеры без боязі некваліфікаванага дзяржаўнага ўмяшання».

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА**

■

## ПЕНСІЙНАЕ ЗАКАНАДАЎСТВА ЗМЯНІЛАСЯ

**Працоўная пенсія па ўзросце, за выслугу гадоў з 1 студзеня 2014 года будзе прадастаўляцца пры ўмове выплаты абавязковых страхавых узносаў у Фонд сацыяльнай абароны насельніцтва не менш за 10 гадоў.**

Такое рашэнне змяшчаецца ва ўказе Прэзідэнта Беларусі ад 3 верасня гэтага года № 389 «Аб некаторых пытаннях пенсійнага забеспячэння і сацыяльнага страхавання», які ўступіў у сілу ўчора. Такая мера прымаецца ў мэтах рацыяналізацыі выдаткаў сродкаў дзяржаўнага сацыяльнага страхавання.

**Святлана БУСЬКО.**

# «ПРЫШЧЭПКА» АД ДАЎГАБУДУ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.



(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

***— Пад гатовае жыллё людзям будуць выдаваць ільготныя крэдыты на існуючых цяпер умовах?***

— Так. Умовы льготнага крэдытавання акрэслены ўказам № 13 кіраўніка дзяржавы. Тут нічога не змянілася. Аднак... Раней у пачатку будаўніцтва кліент не ведаў, колькі грошай яго жыллё будзе каштаваць на фінішы і ці не трэба яму яшчэ дакрэдытоўвацца. Вельмі актуальнай гэтая праблема была ў час моцнай інфляцыі, калі назіралася сур'ёзнае падаражанне будматэрыялаў і энерганосьбітаў.

Цяпер, пры атрыманні кватэры, чалавек будзе дакладна ведаць, колькі яго жыллё каштуе.

***— Сапраўды, гэта спросціць людзям механізм фінансавання атрыманага жылля. Тут відавочны плюс. Аднак ці не павялічыцца агульны кошт жылля ў структуры дзяржзаказу — у параўнанні са старым механізмам ільготнага крэдытавання будаўніцтва?***

— Кошт жылля не залежыць ад спосабу будаўніцтва, але... Па сістэме дзяржзаказу жылыя дамы будуць уведзены ў эксплуатацыю дакладна па графіку нарматыўных тэрмінаў будаўніцтва. Тэрміны будаўніцтва жылых аб'ектаў, з вызначанага пераліку тых эканамічных дамоў, якія рэкамендавана ўзводзіць па дзяржзаказе, звычайна здаюцца ў эксплуатацыю ў тэрмін да года.

***— Праблема даўгабудаў сёння самая актуальная ў галіне...***

— Так. Сёння ў жыллёва-будаўнічых кааператывах, якія сталі праблемнымі па тэрмінах будаўніцтва, ад 40 да 80 працэнтаў сем'яў з'яўляюцца чаргавікамі з ільготным крэдытаваннем. Астатнія члены ЖБК з'яўляюцца асобамі з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў, але без права атрымліваць дзяржпадтрымку. Менавіта ў гэтай катэгорыі людзей у апошнія складаныя часы ўзнікалі праблемы з фінансаваннем будаўніцтва. Падрадчыкі жылога аб'екта ў гэтых выпадках не маюць магчымасці рытмічна будаваць такі жылы дом, бо ён у агульным аб'ёме фінансуецца дрэнна. У такіх сітуацыях будаўнічыя арганізацыі не вінаваты ў стварэнні праблемных дамоў.

На наш погляд, стварэнне сістэмы дзяржзаказу засцеражэ і будаўнічыя арганізацыі ад нерытмічнага фінансавання, і чаргавікоў — ад розных праблем у будаўніцтве ці ад змяненняў умоў (кошту) будаўніцтва на розных этапах узвядзення дамоў.

***— У такіх дамах, пабудаваных па дзяржзаказе, кватэры атрымаюць толькі людзі пэўнай сацыяльнай катэгорыі. Гэта тыя, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў і адначасова права на атрыманне дзяржпадтрымкі ў выглядзе льготнага крэдыту. Аднак тут узнікае слушнае пытанне. А ці хопіць у розных населеных пунктах ці ў раёнах гарадоў гэтых самых ільготнікаў, каб толькі за іх кошт фарміраваць кааператывы вялікіх шматкватэрных дамоў?***

— На першым этапе праблем з фарміраваннем такіх дамоў кліентамі льготных катэгорый не будзе. Нагадаю, што ў наступным годзе плануецца пабудаваць каля мільёна квадратных метраў жылля па дзяржзаказе. На такі аб'ём жылля чаргавікоў з ільготнымі крэдытамі ў Беларусі павінна хапіць. Праблемы з фарміраваннем дамоў сістэмы дзяржзаказу могуць узнікаць у невялікіх раённых цэнтрах. А вось першыя дамы па новай сістэме ў сталіцы і абласных цэнтрах будуць сфарміраваны даволі хутка.

Паўната фарміравання патэнцыяльнымі жыхарамі дамоў сістэмы дзяржзаказу будзе залежаць і ад канкрэтных аб'ёмаў бюджэтнага фінансавання, што накіроўваюцца ў сферу льготнага крэдытавання насельніцтва.

***— Днямі Мінбудархітэктуры сумесна з міністэрствамі фінансаў, эканомікі і прадстаўнікамі банкаўскага сектара краіны падлічыў сярэдні кошт квадратнага метра жылля для чаргавікоў. Паводле зробленага прагноза, па выніках года ён складзе каля 5,9 млн рублёў. Няўжо, зыходзячы менавіта з гэтага кошту «квадрата», цяпер і будзе ажыццяўляцца льготнае крэдытаванне будаўніцтва жылля?***

— Аб'ёмы льготнага крэдытавання вызначаны бюджэтам краіны на гэты год. Таму памеры крэдытаў для грамадзян будуць разлічвацца ў адпаведнасці з тым, што кошт жыллёвага квадрата складае 4,6 млн рублёў.

Мы апелюем лічбамі афіцыйнай статыстыкі. Дык вось, па першым паўгоддзі сярэдні кошт квадратнага метра складаў 4,825 млн рублёў. Удакладню, што гэта кошт «квадрата» ўжо здадзеных у эксплуатацыю дамоў. Частка з гэтых дамоў пачынала будавацца яшчэ ў 2011-м ці нават у 2010 гадах.

***— Што будзе з цэнамі на жыллёвыя метры ў наступным годзе?***

— Кошт квадратнага метра жылля для чаргавікоў, якія маюць права на дзяржаўную падтрымку, будзе акрэсліваецца пасля скрупулёзнага абгрунтоўвання яго памераў на пасяджэннях рабочай групы.

Паводле распрацаванага прагнозу на 2014 год, сярэдні кошт квадратнага метра жылля для чаргавікоў складзе 6,8 млн рублёў. Паказчык па аб'ёме крэдытавання ў разліку на 1 метр плошчы жылых памяшканняў будзе вызначаны пастановай урада з давядзеннем заданняў па жыллі абласцям і гораду Мінску. Розніцу паміж рэальным сабекоштам будаўніцтва і фінансаваннем з бюджэту неабходна будзе аплачваць людзям. У існуючых складаных эканамічных умовах дзяржава і так даволі моцна дапамагае насельніцтву льготнымі крэдытамі, але аб'ёмы такой дапамогі абмежаваны.

***— На наступны год для чаргавікоў запланавана пабудаваць каля 2 млн кв. метраў жылля ў індустрыяльным выкананні. Ці не значыць гэта, што магутнасці нашых домабудаўнічых камбінатаў будуць выкарыстоўвацца не ў поўнай меры?***

— Вы забыліся пра камерцыйнае жыллёвае будаўніцтва, якое актыўна карыстаецца прадукцыяй домабудаўнічых камбінатаў. Акрамя таго, частка канструкцый ДБК накіроўваецца за мяжу. Тут трэба ўзважана балансаваць з аб'ёмамі. Гэта пытанне дасканалага планавання на ўзроўнях аблвыканкамаў і гарвыканкамаў. Менавіта гэтыя структуры павінны забяспечваць заказамі домабудаўнічыя камбінаты, як з боку бюджэтнага будаўніцтва жылля, так і па лініі прадастаўлення будпляцовак прыватным інвестарам.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# ГАНДЛЁВАЯ ІНСПЕКЦЫЯ БУДЗЕ ШТРАФАВАЦЬ ЯК ТРЭБА

Небяспечныя і няякасныя тавары ў хуткім часе павінны знікнуць з беларускіх крам

**Знізіліся аб'ёмы вытворчасці масла, сыра, тытуню. Сёння беларускі спажывец больш давярае прадуктам харчавання айчыннай вытворчасці, а непрадуктовыя тавары часцей выбірае імпартныя. Аднак найбольш увагі намеснік міністра гандлю Беларусі Ірына Наркевіч, размаўляючы з журналістамі, надала якасці і бяспечнасці тавараў у беларускіх крамах.**

### Час несці адказнасць

«Кожная краіна павінна абараняць свой рынак, а значыць, абараняць і сваіх грамадзян». Ствараюцца і прапісваюцца прававыя акты, нормы, законы — але хто іх выконвае? Якраз на глабальную праверку выканання нормаў бяспекі Міністэрства гандлю выдаткоўвае сілы, бо аднымі паперкамі мала што зменіш. Патрэбны канкрэтныя дзеянні. Менавіта дзеля кантролю ў ліпені гэтага года Указам Прэзідэнта «Пра некаторыя меры па аптымізацыі дзяржаўных органаў і іншых дзяржаўных арганізацый, а таксама колькасці іх работнікаў» была створана гандлёвая інспекцыя Міністэрства гандлю. «Надышоў час несці адказнасць, калі ты парушаеш закон, калі прадаеш небяспечныя для грамадзяніна тавары», — так пракаментавала будучыя змены Ірына Уладзіміраўна.

Рэвізоры будуць дыферэнцыраваць парушэнні — ад дробнага да вялікага, і ў гэтай адпаведнасці пазначаць памер штрафу. Гэта значыць, калі раней «штрафнікі» плацілі ад 2 да 10 базавых, то цяпер ёсць шкала «да 10». Фактычна, могуць выпісаць штраф і на 1 базавую, і на палову базавай ці ўвогуле нічога. Што датычыцца скончанага тэрміну прыдатнасці захоўвання, рэалізацыі тавараў, то сітуацыя змянілася: штрафы выраслі ад 30 да 500 базавых. «Гандлёвая інспекцыя ў незалежным парадку будзе штрафаваць як трэба», — адзначыла намеснік міністра.

### Дайце беларускую агародніну і экалагічную ўпакоўку!

Але пакуль што, на жаль, — парушэнні паўсюль. Па выніках 200 правераных інспекцыяй гандлёвых аб'ектаў «выйшлі» 173 рэкамендацыі (а значыць, парушэнняў). Самай папулярнай «слабасцю» крам у Беларусі з'яўляецца асартыментны пералік. Напрыклад, усім вядомая адсутнасць беларускай агародніны, зеляніны. Дарэчы, такі грэх мае масавую скіраванасць менавіта ў так званых сетках крам. Няма айчынных яблыкаў у адной краме — не будзе і ў іншых.

Набалелае пытанне — упакоўка тавару. Калі прадавец прапаноўвае пакупніку пакецік за асобную плату, то гэта лічыцца «навязваннем». У хуткім часе сітуацыя павінна змяніцца: па патрабаванні спажыўца прадавец будзе абавязаны перадаць тавар у бясплатнай упакоўцы. Адзначыла намеснік міністра і той факт, што ў Мінску пачалі «пакаваць» у экалагічныя пакеты з паперы.

### Гарэлку вадой не замаскіруеш

«Рэпрэсіі» дойдуць і да рэкламы парасонавых брэндаў — у нашым выпадку, яны выкарыстоўваюцца для рэкламы аднаго віду тавару пад выглядам іншага. Напрыклад, рэклама гарэлкі пад відам рэкламы мінеральнай ці пітной вады. Адзінае афармленне — лагатып і назва — дазваляе павялічыць продаж менавіта гарэлкі. Падобныя білборды ўсё часцей з'яўляюцца і ў беларускай сталіцы, таму барацьба з псеўдарэкламай — яшчэ адна мера па дэалкагалізацыі насельніцтва. А 30 снежня 2013 года пачне дзейнічаць новы закон па абароце алкаголю.

Вялікаму падману — вялікія штрафы. Будзем спадзявацца, што новыя меры сапраўды зменяць сітуацыю з няякаснымі таварамі ў айчынных крамах у лепшы бок.

**Кацярына РАДЗЮК.**

# «СВАЁ МЕСЦА» Ў КІТАІ

**«Хуаньін! Хуаньін!» («Сардэчна запрашаем!»), — віталі беларускія і кітайскія студэнты ганаровага госця Лю Юньшаня, члена Пастаяннага камітэта Палітычнага бюро Цэнтральнага камітэта Камуністычнай партыі Кітая. Дэлегацыя спадара Лю Юньшаня разам з міністрам адукацыі Беларусі Сяргеем Маскевічам наведала Рэспубліканскі інстытут кітаязнаўства імя Канфуцыя Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.**

У якасці прывітання студэнты праспявалі слупок вядомай песні «Кацюша». Праўда, для беларускага вуха па-кітайску песня гучала трошкі нязвыкла, але Лю Юньшаню, які наведаў нашу краіну ўпершыню, спадабалася.

У рамках візіту госць пабываў на аўдыторных занятках па кітайскай мове. Што цікава, на базе ўстановы дзейнічаюць курсы ў тым ліку і для малодшых школьнікаў.

Асобным пунктам было абмеркаванне супрацоўніцтва паміж беларускім і кітайскім бакамі ў галіне адукацыі. Студэнты з Паднябеснай прысутнічаюць ці не ў кожнай беларускай ВНУ. Так, па словах міністра адукацыі Сяргея Маскевіча, каля 30 беларускіх універсітэтаў маюць больш за сто прамых дагавораў па супрацоўніцтве ў галіне адукацыі. Але і ў Кітай з кожным годам на вучобу прыязджае ўсё больш беларускіх студэнтаў. «Ад імя штаб-кватэры кітайскіх Інстытутаў Канфуцыя мы даём 100 бюджэтных месцаў студэнтам Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта і Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта для таго, каб яны мелі магчымасць вучыцца ў Кітаі», — адзначыў Лю Юньшань.

**Насця Казачонак, студэнтка філалагічнага факультэта БДУ,** была сярод прысутных на сустрэчы з кітайскім госцем. Дзяўчына мае добрую магчымасць атрымаць адно з прадастаўленых кітайскім бокам бюджэтных месцаў. Насця вучыцца на другім курсе і вывучае ўсходнюю філалогію.

— Я пачала наведваць Інстытут Канфуцыя яшчэ ў восьмым класе і хадзіла туды на курсы да адзінаццатага, — расказвае дзяўчына. — Мая сястра таксама вучылася ў Інстытуце Канфуцыя, а пасля падала дакументы на грант — і вось ужо жыве ў Кітаі чатыры гады. Таму ў мяне ёсць стымул вучыць кітайскую мову — гэта добра і для працягу адукацыі, і ў плане будучай зарплаты.

Нягледзячы на тое, што на тым жа філфаку ёсць магчымасць вучыць і італьянскую мову, і тую ж англійскую, якая лічыцца мовай міжнародных стасункаў, Насця не шкадуе пра свой выбар.

— У нас практыка — круглы год. Кітайцаў на факультэце шмат, а вось англічан, немцаў ці італьянцаў я нешта не згадаю. Ды і выкладчыкі ёсць кітайскія. Таму, хоць гэтая мова і лічыцца вельмі складанай, з такімі магчымасцямі ў мяне ёсць усе шанцы да пятага курса стаць добрым спецыялістам у гэтай галіне.

Інстытуты Канфуцыя ёсць у многіх краінах. З мэтай распаўсюджвання кітайскай мовы і культуры такіх устаноў створана 322. Што цікава, Інстытут Канфуцыя пры БДУ яшчэ ў пазамінулым годзе ўвайшоў у дваццатку лепшых Інстытутаў Канфуцыя ў свеце.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**

■ Надвор'е

# СОНЕЧНА НА ВЫХАДНЫЯ І НЕ ТОЛЬКІ...

**Цудоўнае сонечнае надвор'е чакаецца на тэрыторыі Беларусі ў бліжэйшыя пяць дзён, паведаміла карэспандэнту «Звязды» начальнік аддзела метэапрагнозаў Рэспубліканскага гідраметэацэнтра Святлана РЫБАКОВА.**

Балтыйскі цыклон, які ў пачатку гэтага тыдня сапсаваў надвор'е ў рэспубліцы, пакінуў нашу краіну. Таму ў бліжэйшыя суткі дажджлівае надвор'е захаваецца толькі на ўсходзе Беларусі, а на астатняй тэрыторыі пад абаронай антыцыклону ападкаў не чакаецца. Пры гэтым з-за парывістага паўночнага ветру будзе даволі халаднавата, асабліва раніцай.

Максімальная тэмпература паветра сёння ўдзень складзе 15-21 цяпла, ва ўсходніх раёнах з-за шчыльных аблокаў будзе ўсяго плюс 11-14 градусаў. Такім чынам, на ўсходзе тэмпературны фон стане на 3-5 градусаў ніжэй за кліматычную норму, а на астатняй тэрыторыі краіны будзе блізкім да сярэдніх шматгадовых значэнняў.

На выхадныя ў краіне будзе гаспадарыць антыцыклон. У сувязі з гэтым чакаецца пераважна без ападкаў, толькі ў суботу ўначы і раніцай у крайніх паўднёва-ўсходніх раёнах Гомельскай і Магілёўскай абласцей яшчэ магчымыя кароткачасовыя дажджы. У начныя і ранішнія гадзіны месцамі па захадзе магчымы туманы. Вецер паўночны ўмераны. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 4-11 градусаў, месцамі — ад 1 да 3 цяпла, удзень — ад 15 да 22 градусаў. Не чакаецца ападкаў і ў нядзелю, вецер сціхне, уначы і раніцай месцамі магчымы туманы. Тэмпература паветра ўначы не зменіцца, а ўдзень стане ад плюс 17 градусаў на ўсходзе да 24 цяпла на захадзе краіны.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, цудоўнае восеньскае надвор'е захаваецца і ў панядзелак. А вось у аўторак да нас завітае зона паніжанага атмасфернага ціску, сфарміраваная ва ўмерана цёплай і вільготнай паветранай масе над Заходняй Еўропай.

У сувязі з гэтым у аўторак і сераду ў асобных раёнах краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, уначы і раніцай месцамі туман. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 4-11 градусаў, месцамі чакаецца 13 градусаў вышэй за нуль, удзень паветра прагрэецца да плюс 15-22, а па поўдні Гомельскай і Брэсцкай абласцей месцамі да 23-25 градусаў. Доўгатэрміновы прагноз спецыялістаў сведчыць аб тым, што ў чацвер умовы надвор'я ў многіх раёнах Беларусі сапсуюць актыўныя атмасферныя франты з Заходняй Еўропы.

А зараз некалькі слоў пра «касмічнае» надвор'е. Навукоўцы, якія назіралі за сонцам, прагназуюць шэсць магутных магнітных бур у гэтым месяцы, паведамляюць інфармагенцтвы. Пасля магутнай успышкі на Сонцы жыхароў планеты Зямля чакае адразу шэсць дзён магнітных бур, наймацнейшыя геамагнітныя буры чакаюцца 7, 13, 14, 15, 17 і 27 верасня. У гэты час дактары раяць гіпертонікам, людзям, якія пакутуюць ад вегетасасудзістай дыстаніі, і тым, хто перанёс інсульт і інфаркт, уважліва ставіцца да свайго здароўя.

Медыкі рэкамендуюць устрымацца ад цяжкай ежы і пераядання, таксама раяць не ўжываць алкагольныя напоі, не парушаць рэжым дня і адмовіцца ад цяжкіх фізічных нагрузак.

**Сяргей КУРКАЧ**

■

## СТВАРАЕЦЦА АСОБНЫ ТРЭЙДАР ААТ «БКК» ДЛЯ КААРДЫНАЦЫІ ЭКСПАРТНЫХ ПАСТАВАК КАЛІЙНЫХ УГНАЕННЯЎ

**Беларусь стварае асобнага трэйдара ААТ «Беларуская калійная кампанія» для каардынацыі экспартных паставак калійных угнаенняў. Як паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе Прэзідэнта, адпаведны ўказ № 399 «Аб удасканаленні экспарту калійных угнаенняў» Аляксандр Лукашэнка падпісаў 5 верасня.**

У мэтах рэалізацыі калійных угнаенняў прадугледжана рэгістрацыя новай гандлёвай кампаніі з аналагічнай ЗАТ «Беларуская калійная кампанія» назвай, але ў іншай прававой форме — ААТ «Беларуская калійная кампанія». У сувязі з гэтым наваствоpанай кампаніі прадастаўлена рэалізоўваць выключнае права знешняга гандлю (у частцы экспарту) мінеральнымі або хімічнымі калійнымі ўгнаеннямі, замацаванае за дзяржавай, а таксама распаўсюдзіць на яе дзеянне норм указа ад 25 жніўня 2005 года № 398 «Аб удасканаленні экспарту калійных угнаенняў» і іншых нарматыўных прававых актаў Рэспублікі Беларусь, якія рэгулююць дзейнасць ЗАТ «БКК». Такім чынам, на ААТ «Беларуская калійная кампанія» будзе ўскладзена каардынацыя ўсіх экспартных паставак беларускіх калійных угнаенняў. Гэта дасць магчымасць захаваць за Рэспублікай Беларусь добра вядомы на сусветным рынку брэнд, сэканоміць час і рэсурсы для арганізацыі ўласнага трэйдара і ў поўнай меры скарыстацца напрацоўкамі ЗАТ «БКК» у частцы наладжаных кантактаў са спажыўцамі і збытавых каналаў, адзначылі ў прэс-службе. Аснову кадраў складуць беларускія спецыялісты ЗАТ «БКК». Генеральны дырэктар створанай структуры будзе, у парадку выключэння, сумяшчаць гэту пасаду з выкананнем абавязкаў генеральнага дырэктара ЗАТ «БКК».

Аляксандр Лукашэнка падпісаў таксама ўказ № 400 «Аб устанаўленні стаўкі вывазной мытнай пошліны на калійныя ўгнаенні і ўнясенні дапаўненняў і змяненняў ва ўказы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 3 кастрычніка 2011 г. № 442 і ад 17 студзеня 2012 г. № 37».

Для забеспячэння стабільнай работы ААТ «Беларуськалій» прадугледжана ўстанаўленне з 1 верасня 2013 года да 31 снежня 2013 года нулявой стаўкі вывазной мытнай пошліны на калійныя ўгнаенні. Акцыянернаму таварыству таксама прадастаўлена адтэрміноўка па выплаце ў рэспубліканскі бюджэт разавага плацяжу за права карыстання нетрамі (Петрыкаўскае радовішча) да 31 снежня 2014 года.

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

### ПАКУПНІК НЕ АБАВЯЗАНЫ ПАКАЗВАЦЬ ПАШПАРТ ПРЫ РАЗЛІКУ БАНКАЎСКАЙ КАРТКАЙ

**Абавязковае патрабаванне аб прад'яўленні трымальнікам карткі дакумента, які пацвярджае асобу, пры аплаце тавараў (паслуг) у арганізацыі гандлю (сэрвісу) не прадугледжваюцца нарматыўнымі прававымі актамі Нацбанка і правіламі плацежных сістэм, паведамляецца на сайце галоўнага банка краіны.**

Згодна з Інструкцыяй аб парадку ажыццяўлення аперацый з банкаўскімі плацежнымі карткамі (зацверджана праўленнем Нацбанка 18 студзеня 2013 года), эмісія картак уключае іх персаналізацыю. Пры персаналізацыі інфармацыя аб трымальніку можа наносіцца на загатоўку карткі, калі такое правіла прадугледжана правіламі плацежнай сістэмы. Выкарыстоўваць картку мае права толькі тая асоба, чые імя, прозвішча і (ці) подпіс прастаўлены на картцы. Трымальнік карткі абавязаны паставіць асабісты подпіс на адваротным баку і захоўваць свой ПІН-код у тайне. Перадача карткі і ПІН-кода да яе трэцяй асобе, якая не з'яўляецца трымальнікам, забаронена, аднак уладальнік картрахунку можа аформіць у банку-эмітэнце дадатковую картку на імя таго, каму хоча даць права карыстацца сваімі грашыма.

У асобных выпадках (напрыклад, не супаў подпіс пакупніка на карт-чэку з подпісам на адваротным баку карткі) работнік арганізацыі гандлю (сэрвісу) можа прапанаваць трымальніку карткі прад'явіць дакумент, які пацвярджае асобу, ці ўвесці ПІН-код, калі гэта магчыма, альбо разлічыцца гатоўкай.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.**

### КАДЭЦКАЕ ВУЧЫЛІШЧА АДКРЫЛАСЯ Ў ГОМЕЛІ

**У Дзень ведаў гомельская сярэдняя школа № 20 атрымала новы статус. Навучальная ўстанова цяпер мае назву кадэцкага вучылішча — адзінага ў сваім родзе ў Гомельскай вобласці. Цяпер тут атрымліваюць адукацыю 170 вучняў — 107 кадэтаў і 63 навабранцы.**

«Першагодак» завуць навабранцамі невыпадкова, бо, каб атрымаць званне кадэта, трэба прайсці ўрачыстае пасвячэнне, а пасля двух месяцаў вучобы даць клятву. Пакуль маладое папаўненне прыняло ўдзел ва ўрачыстай вераснёвай лінейцы. Яна ў кадэцкім вучылішчы прайшла з маршам і пад музыку ваеннага аркестра. Вучняў віталі не толькі прадстаўнікі ўлад Гомеля, але і сілавых структур: упраўленняў унутраных спраў, па надзвычайных сітуацыях, вайсковай часці № 1242, ваенных камісарыятаў горада і вобласці. Дарэчы, епіскап Гомельскі і Жлобінскі Сцяфан таксама блаславіў будучых вайскоўцаў на добрую вучобу.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

### ЯК АФІЦЫЯНТ З ШАМПАНІ ЗАВІТАЎ НА МЯЖУ

Афіцыянт з французскай правінцыі Шампань працаваў у сваім рэстаране чатыры гады, а потым пасварыўся з гаспадаром установы, звольніўся і вырашыў працягваць кар'еру ў іншай краіне. Так ён, прынамсі, расказваў брэсцкім памежнікам. А паколькі даўно перапісваўся па інтэрнэце з брастаўчанінам, то і вырашыў паехаць у Брэст. Тым больш што Брэст для француза — слова не чужое, на захадзе Францыі ёсць партовы горад з такой назвай. 20-гадовы падарожнік захапіў з сабой фартух, белую кашулю і гальштук — усё, неабходнае для работы, узяў таксама крыху прадуктаў харчавання, дакументы і 10 еўра. Да мяжы ён даехаў аўтастопам, а потым проста пехам пашыбаваў у Беларусь. Тут яго і сустрэлі нашы вартавыя мяжы.

Паводле слоў 20-гадовага парушальніка, ён нават не ўяўляў, што ў Беларусі з Еўрасаюзам існуе мяжа, якую нельга перасякаць без такіх фармальнасцяў, як віза. Цяпер на небараку-гарсона складзены адміністрацыйны пратакол за незаконнае перасячэнне мяжы.

**Яна СВЕТАВА.**


Извещение о проведении 07 октября 2013 года торгов по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Опытно-механический завод»

| | |
|---|---|
| Предмет торгов (сведения о продаваемом имуществе) | Металлический ангар общей площадью 84,7 кв. м, инвентарный номер 600/С-141268, расположенный по адресу: Республика Беларусь, Минская область, Минский район, Папернянский с/с, 34/2 (район аг. Большевик); назначение – здание неустановленного назначения |
| Сведения о продавце | ОАО «Опытно-механический завод», ул. Лукьяновича, 10, 220113, г. Минск, телефон (017) 262-00-08 |
| Сведения об организаторе торгов | УП «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск, телефон (017) 327-48-36 |
| Начальная цена предмета торгов (без НДС) | 97 228 000 белорусских рублей |
| Сумма задатка | 5 000 000 белорусских рублей |

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества ОАО «Опытно-механический завод», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов в установленный срок следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию документа, подтверждающего внесение задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012104971019 в региональной дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369, УНП 190398583 в срок, установленный для приема документов на участие в торгах.

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в течение 3 дней со дня проведения аукциона. Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) подписывается в течение 3 дней со дня проведения аукциона.

Торги проводятся 07 октября 2013 года в 16.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 06.09.2013 по 01.10.2013 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К.Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок: (017)327-48-36, (017)262-00-08.

■ Медыяперсона

Юлія ЗЫКАВА:

# «ПАСЛЯ ПЕРШАГА ЭФІРУ АДЧУВАЛА СЯБЕ ТАК, НІБЫТА НАНАВА НАРАДЗІЛАСЯ»

**Каб мара стала рэальнасцю, трэба зрабіць яе мэтай і дзейнічаць. Такая формула якраз і адлюстроўвае гісторыю вядучай «Сталічных падрабязнасцяў» на канале СТБ Юліі Зыкавай. Сваю прафесійную прыдатнасць дзяўчына правярала рознымі спосабамі: рабіла з сяброўкай «радыё-праграму» для знаёмых, тэлефанавала на розныя шоу, каб паўдзельнічаць у конкурсах, пісала для газет, часопісаў, інтэрнэт-выданняў… Аднак бацькі Юліі без энтузіязму ўспрынялі яе жаданне звязаць сваё жыццё з гэтай сферай і настаялі на тым, каб дачка пачала вывучаць замежныя мовы. Як аказалася, такі крок толькі наблізіў да мары, і яна трапіла на блакітны экран…**



**— Калі вы трапілі на тэлебачанне?**

— Стаўшы студэнткай, я пачала паралельна працаваць на ім, бо заўсёды ведала, што хачу, каб было менавіта так. А пачалося ўсё яшчэ ў той час, калі вучылася ў школе. Па тэлевізары паказвалі каманду КВЗ Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, тады быў іх «зорны» перыяд. Я глядзела на іх і разумела, што таксама хачу быць на экране тэлевізара. Не магла патлумачыць сваё жаданне, але пачала думаць, як можна туды трапіць. Добра разумела, што жартаваць я не ўмею, не спяваю і не танцую, таму заставаўся толькі адзін варыянт — стаць журналістам. Калі расказала пра свае планы бацькам, то пачула: «Ні пра што такое нават не думай. У нас няма знаёмых на тэлебачанні. Паступай ва ўніверсітэт!» На што я адказала: «Паглядзіце, я буду на тэлебачанні!»

**— Першыя эфіры, праекты памятаеце?**

— Пасля першага эфіру, калі я выйшла ў горад, то мне здавалася, быццам усе на мяне глядзяць. Я ішла, назірала за людзьмі і адчувала сябе так, нібыта нанава нарадзілася. Думала, што ўсе паглядзелі маю пяціхвілінную перадачу, і цяпер я буду вядомай. Але, зразумела, нічога такога і блізка не было. Акрамя маіх бацькоў, можа, ніхто яе і не глядзеў, аднак пачуццё эйфарыі не пакідала. Як маладая дзяўчына, цікавілася модай, поп-культурай. Была ўпэўнена, што мой інтарэс да гэтай тэмы павінны раздзяляць і іншыя, таму вырашыла сумясціць веды, набытыя ва ўніверсітэце, і працу на тэлебачанні. Мая першая праграма была «Агляд прэсы», дзе я брала рэальныя англамоўныя крыніцы пра культурнае і свецкае жыццё і, перакладаючы іх, рабіла агляд навін.

**— З часам ваш інтарэс да свецкага жыцця вычарпаў сябе?**

— Час ад часу мне здаецца, што я стала дарослай і мой інтарэс знік, але ўсё ж бывае чытаю, гляджу нешта па тэме. Цяпер мне ўжо цікава не тое, хто з кім сустракаецца і як

> **Добра разумела, што жартаваць я не ўмею, не спяваю і не танцую, таму заставаўся толькі адзін варыянт — стаць журналістам.**

апранаецца, а больш акцэнтую ўвагу на тым, як падаецца інфармацыя. Пры праглядзе тэлевізійных праграм пачынаю аналізаваць, у якім месцы я падала б тыя ці іншыя падзеі па-іншаму. Відаць, дае пра сябе знаць «прафесійная хвароба».

**— Вам знаёмае пачуццё няўпэўненасці перад камерай?**

— Сёння я ўжо магу казаць, што змагла яго пераадолець. Памятаю, калі апынулася перад камерай першы раз, то чаго толькі не было: і словы блытала, хоць тэкст быў вывучаны на памяць, і вочы не ведала куды падзець… Зараз тых перажыванняў няма, я нават перад эфірам магу займацца нейкімі сваімі пытаннямі, а потым засяроджваюся і пачынаю працаваць. І гэта ўжо прафесіяналізм, якому проста неабходна навучыцца, бо інакш ніякіх нерваў не хопіць. Калі нейкае хваляванне і ўзнікае, то проста настройваю сябе на тое, што ўсё пройдзе добра.

**— А «зорная хвароба» для вас не характэрна?**

— Я ведаю многа прыкладаў, калі людзі працуюць на тэлебачанні нашмат даўжэй, чым я, і дасягнулі значна большага, але ў іх не адчуваецца ніколі «зорнасці». Спадзяюся, што і ў мяне яе няма. Я не хаджу з высока паднятай галавой. Магу спакойна зайсці ў любую краму. Бывае, мяне пазнаюць. Давоадзіцца шэпт чуць за спінай, маўляў, «думалі, яна ў жыцці не такая». Імкнуся не звяртаць на такія моманты ўвагі.

**— Вечарынкі, тусоўкі для некаторых — амаль што лад жыцця. На ваш погляд, чаму людзі імкнуцца апынуцца ў «коле абраных»?**

— У нашай мінскай тусоўцы няма абраных. Практычна любы можа туды трапіць пры жаданні, але не ўсе хочуць. Я хацела, бо гэтага патрабавала мая работа. І да гэтай пары я падтрымліваю кантакты са многімі артыстамі, хоць ужо і не патрэбны ніякія каментары.

**— Вобраз на экране адрозніваецца ад таго, як вы выглядаеце ў жыцці?**

— Многія кажуць, што розніцы не адчуваецца. Магчыма, з-за таго, што «Сталічныя падрабязнасці» — гэта навіны пра жыццё горада. Яны не настолькі сур'ёзныя, як, скажам, навіны краіны. Я, у сваю чаргу, стараюся падачу навін недзе ўсмешкай разбавіць, перадаць сваё стаўленне да падзеі.

**— Вы неяк сказалі, што «Сталічныя падрабязнасці» — той фармат, у якім вам камфортна працаваць. Няўжо няма ніякіх прафесійных амбіцый?**

— Амбіцыі ёсць ва ўсіх, і я не выключэнне. Але гэта не імкненне мець нейкі свой праект. Я атрымала рэжысёрскую адукацыю і вельмі хачу расці прафесіянальна ў гэтым напрамку. Ужо зрабіла некалькі дакументальных фільмаў, ёсць вопыт здымак кліпаў, рэкламы. Пакуль што я на пачатковым этапе.

**— Маеце нейкі рэцэпт, як гарманічна сумяшчаць працу і асабістае жыццё?**

— Сакрэт, на мой погляд, у тым, што не варта цалкам прысвячаць сябе толькі нейкай адной сферы. Трэба ўмець сябе стрымліваць і не пераходзіць мяжу. У мяне бывае так: калі ўзнікае жаданне «рынуцца ў працу», я пытаюся ў сябе: «А ці прыгатавана вячэра для мужа? Калі я бацькам тэлефанавала апошні раз?» Проста разумею, што ёсць справы, абмінуўшы ўвагай якія, потым буду шкадаваць. Аднак, бывае, пасля працяглага адпачынку мяне так і цягне папрацаваць… Цяпер вось вярнулася з водпуску і мару паглыбіцца ў работу.

**— Як лічыце, што трэба, каб дасягнуць поспеху ў прафесіі?**

> **У мяне бывае так: калі ўзнікае жаданне «рынуцца ў працу», я пытаюся ў сябе: «А ці прыгатавана вячэра для мужа? Калі я бацькам тэлефанавала апошні раз?»**

— Трэба шмат працаваць без адпачынку, сну і асабістага жыцця. Я не належу да ліку тых людзей, якія будуць ахвяраваць такімі момантамі дзеля працы. Ведаю, як магу працаваць, які мой патэнцыял, але на гэтым этапе праца «да страты пульсу» ў мяне не ў прыярытэце. Таму вечары я прысвячаю блізкаму чалавеку, знаходжу час для адпачынку і прачынаюся бадзёрай для сустрэчы новага дня.

**— Па якіх прынцыпах ладзіце жыццё?**

— Калі я прымаю нейкае рашэнне, то галоўнае для мяне — не адчуваць сумненняў. Нават калі бываюць сітуацыі, што мой пункт гледжання не супадае з агульнапрынятым. Калі адчуваю, што зраблю нешта, а потым буду сябе дакараць, ніколі не буду дзейнічаць.

**Алена ДРАПКО**

■ Медыяпрастора

## Кінаметраж

| | | | |
|---|---|---|---|
| Брэст | 106.6 FM | Бабруйск | 103.6 FM |
| Віцебск | 101.8 FM | Баранавічы | 98.4 FM |
| Мінск | 107.1 FM | Салігорск | 104.3 FM |
| Гродна | 104.2 FM | Пінск | 103.2 FM |
| Магілёў | 107.8 FM | | |

Беларусы любяць сямейнае кіно. Пацвярджэнне таму — аб'явы на касах «Усе квіткі прададзены» падчас прэм'еры мультфільмаў. Нават на дзённы сеанс анімацыйнай стужкі «Гадкі я — 2» гледачы раскупілі 97 адсоткаў квіткоў. Такая напаўняльнасць залы ў будны дзень, ды яшчэ і на ранні сеанс, сведчыць пра многае. Генеральны дырэктар прадпрыемства «Кінавідэапракат» Васіль Коктыш распавёў, што гэты мультфільм ёсць і ў пяцёрцы самых касавых карцін у Беларусі за студзень—чэрвень 2013 года. Лідар прыбытковага кіно — працяг «Жалезнага чалавека». На другім месцы — «Хобіт: Нечаканае падарожжа». Затым ідзе «Фарсаж», чацвёртая — «Сямейка Крудс». Пакуль у пяцёрцы самых грашовых і расійская спартыўная драма «Легенда № 17», якой, па прагнозах, давядзецца ўсё ж вызваліць месца для мультфільма «Гадкі я — 2».

А што яшчэ новага і цікавага ў кінаіндустрыі? Кожную пятніцу ў 14:45 у праграме «Кінаметраж» на радыё «Мір» мы падводзім вынікі мінулых выхадных і высвятляем, хто цяпер у лідарах пракату. Яшчэ мы прыглядаемся да навінак, не забываючы пры гэтым зазірнуць на сусветныя здымачныя пляцоўкі і даведацца, чым жа нас неўзабаве здзівяць вядомыя рэжысёры і ў каго пераўвасобіліся зоркі першай велічыні.

Будзьце ў курсе кінападзей, глядзіце добрае кіно і слухайце «Кінаметраж» на хвалях радыё «Мір»!

■ Запрашальнік

## ЗУБР З ВАРЫЯЦЫЯМІ

### У МІНСКУ ПРОЙДЗЕ ДРУГІ ФЕСТЫВАЛЬ 3D-МАЛЮНКАЎ «ХВАРЭЕМ» ЗА НАШЫХ!»

**7 верасня сталічны парк імя Горкага ператворыцца ў перасоўную карцінную галерэю. Ды не простую, а ў фармаце 3D! Проста на вачах шаноўнай публікі мастакі створаць шэраг 3D-малюнкаў, прысвечаных Чэмпіянату свету па хакеі 2014 года.**



Прыклад 3D-карціны, намаляванай у дзвюх плоскасцях.

*ДАВЕДКА «ЗВЯЗДЫ»*

Эфект 3D у малюнках дасягаецца дзякуючы тэхніцы скажэння выявы. Для такіх карцін не патрэбны адмысловыя прылады кшталту акуляраў з рознакаляровымі лінзамі, проста на іх неабходна глядзець з пэўнага месца, каб на гарызантальнай паверхні стваралася аптычная ілюзія аб'ёму.

Фестываль 3D-карцін пройдзе ў Беларусі ўжо другі раз, але сёлета ён мае статус міжнароднага. Акрамя айчынных мастакоў і камандаў з Мінска, Гомеля і Віцебска, пацвердзіў свой удзел прадстаўнік Украіны мастак Уладзімір Пастушак, чакаюцца ў госці таксама расіяне. Тэмай жа для творчасці выбраны талісман будучых спаборніцтваў — зубр, якога неабходна будзе праз малюнак «звязаць» з найлепшымі хакейнымі краінамі паводле Міжнароднай хакейнай асацыяцыі: Швецыяй, Фінляндыяй, Расіяй, Чэхіяй, Канадай, ЗША, Швейцарыяй, Славакіяй, а таксама з нашай роднай краінай — гаспадыняй чэмпіянату. Такім чынам, у 9 каманд — удзельніц фестывалю мусіць атрымацца 9 малюнкаў.

«Калі летась мы малявалі на асфальце, то сёлета, з улікам заўвагі наведнікаў, кожная 3D-карціна будзе ўяўляць сабой пераносную фотазону,— расказаў «Звяздзе» прадстаўнік арганізатараў фестывалю.— Прасцей кажучы, малюнкі будуць выконвацца на дошках, размешчаных у дзвюх плоскасцях, нібыта адкрытая кніга,— гэта дазваляе стварыць асаблівы эфект глыбіні выявы». Найлепшым мастакам дастанецца галоўны прыз ад Дырэкцыі па правядзенні ЧС па хакеі — сертыфікат на білеты на пэўны матч чэмпіянату.

Наведнікаў фестывалю, акрамя ўласна мастацкай яго часткі, таксама чакае забаўляльная праграма з удзелам вулічных танцораў і велатрыялістаў, а таксама гульнявыя пляцоўкі рознай скіраванасці. Арганізатары папярэджваюць: у выпадку дрэннага надвор'я фестываль можа быць перанесены!

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК**

■ Спецыфічны напой

## АЛКАГОЛЬ ПАСЛЯ... МАЛАКА

**Ён можа ўзняць настрой, «раскалоць» галаву на часткі, спрыяльна паўплываць на здароўе, выклікаць залежнасць… Аб ап'яненні вядома кожнаму. Аднак мала каму — аб спосабе ўздзеяння алкаголю і яго рэальных механізмах, заўважае японская JB Press. З пытаннямі пра алкаголь карэспандэнт звярнуўся да спецыяліста, які прадстаўляе псіхатэрапеўтычную клініку ў Токіа, працяглы час практыкаваў лячэнне алкагалізму ў дзяржаўным шпіталі і валодае шырокімі ведамі пра алкаголь у цэлым. Вось некаторыя пытанні і адказы.**

### Чаму чалавек п'янее?

Алкаголь паралізуе дзеянне мозга. Алкаголь пранікае ў арганізм і ўсмоктваецца сценкамі страўніка і кішэчніка. Затым ён перапрацоўваецца ў печані. Незасвоены алкаголь адпраўляецца да сэрца і разносіцца па ўсім целе, уключаючы мозг. Прыкладна праз 10 хвілін пасля ўжывання спіртнога алкаголь дасягае мозга. Чым больш вы п'яце, тым горшай становіцца каардынацыя. Эмоцыі вызваляюцца з-пад кантролю, таму можа быць выбух у выглядзе плачу ці нястрымнага смеху. Калі працягваць піць далей, алкаголь дасягае мазжачка, з-за чаго ногі становяцца ватнымі або цела перастае рухацца наогул. Калі не спыніцца і на гэтым, то будзе паралізаваны аддзел мозга, які адказвае за кантроль аўтаномных функцый, напрыклад, дыхання і прытомнасці. Надыходзіць вострае алкагольнае атручэнне, ад якога недалёка да смяротнай небяспекі.

### Не ўсе людзі чырванеюць?

Па меры таго, як алкаголь расшчапляецца ў печані, ён ператвараецца ў ацэтальдэгід. На гэтай стадыі і з'яўляецца галаўны боль. Актыўнасць галаўнога болю вызначаецца ўзроўнем у арганізме спецыяльных ферментаў, якія вызначаюцца на генетычным узроўні. Аматары выпіць атрымліваюць ад сваіх бацькоў гены, якія адказваюць за актыўнасць згаданых ферментаў. Такія людзі не чырванеюць, калі прымаюць спіртныя напоі. Людзі, што атрымалі ад абаіх бацькоў гены, якія не падтрымліваюць такія ферменты, не могуць піць. Іх твар можа чырванець нават ад марынаванай у віне гародніны. Такіх людзей вельмі мала. Астатнія атрымалі гены, якія актывізуюць патрэбныя ферменты, ад аднаго з бацькоў. Калі такі чалавек выпівае, то чырванее, аднак пасля адпаведнай «трэніроўкі» яны могуць піць усё больш і больш.

Тыя людзі, якія з самага пачатку маглі выпіць шмат, адносяцца да «тых, што не чырванеюць». Людзі, якія перабралі першы раз і адчулі сябе дрэнна, аднак пасля змаглі піць усё больш і больш, могуць лічыць, што адзін з бацькоў перадаў ім ген, які адказвае за актыўнасць памянёных ферментаў.

### Калі змяшаць віно і гарэлку, будзе дрэнна?

У асноўным гэта адбываецца з-за вялікай колькасці алкаголю, які паступае ў арганізм. Можна думаць, што людзі, якія змешваюць розныя віды спіртных напояў, у выніку п'юць больш. Нельга адмаўляць і ўплыў рэчываў, якія ўваходзяць у склад сакэ, акрамя алкаголю. Аднак асноўным фактарам узнікнення млосці з'яўляецца вялікая колькасць ужытага алкаголю.

### Алкаголь — прычына атлусцення?

Большасць пацыентаў, што пакутуюць на алкагольную залежнасць, і п'юць выключна спіртныя напоі, вельмі худыя. Алкаголь часта называюць «пустой энергіяй». Нягледзячы на тое, што ў алкаголі прысутнічаюць калорыі, гэта энергія адразу спальваецца, у арганізме нічога не застаецца. Аднак у выніку ўжывання алкагольных напояў метабалізм тлушчаў, атрыманых з ежы, запавольваецца. Акрамя таго, аказваецца ўплыў і на расшчапленне цукраў. З гэтай прычыны ежа, якая паступае ў арганізм разам з алкаголем, а таксама вялікая колькасць цукру, што прысутнічае ў піве і віне, лёгка назапашваюцца ў арганізме. Гэта можа стаць прычынай атлусцення.

### Перад бяседай — малако?

Малекулы алкаголю вельмі дробныя, яны могуць пранікаць з сасудаў у тканкі галаўнога мозга. Нават калі на сценках страўніка з'явіцца «малочная плёнка», яна не перашкодзіць усмоктванню дробных малекул алкаголю. Аднак падчас аднаго эксперымента высветлілася, што хуткасць метабалізму алкаголю ў печані была больш высокай у таго чалавека, які піў малако. Іншымі словамі, яму было прасцей працверазець. Атрымліваецца, калі прымаць малако і бялкі разам са спіртнымі напоямі, то метабалізм алкаголю пройдзе хутчэй. Эфекту хуткага працверажэння можна дабіцца і за кошт, напрыклад, салодкага.

**Падрыхтавала Святлана БАРЫСЕНКА**

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

## ПАНЯДЗЕЛАК, 9 ВЕРАСНЯ

### БЕЛАРУСЬ 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 23.20** Навіны.
**7.05, 8.05** Дзелавое жыццё.
**7.10, 8.10, 19.40, 23.00** Зона Х.
**9.10** У цэнтры ўвагі.
**10.05 Камедыя «Трывалы шлюб».**
**12.10** Дзень у вялікім горадзе.
**13.15** «Зорнае жыццё». «Татавы дочкі. Без дзяцінства».
**14.15** Вакол планеты.
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25** Журналісцкае расследаванне.
**15.55** Заўтра — гэта мы!
**16.25** Усё як трэба!
**16.50 Меладрама «Удача напракат».**
**19.20** Спецыяльны рэпартаж АТН.
**19.55 Серыял «Вангелія».**
**21.00** Панарама.
**21.45 Серыял «У кожнага свая вайна».**
**23.35** Дзень спорту.
**23.50 Баявік «Ідэальныя ўцёкі».**

### БЕЛАРУСЬ 2

**7.00** Раніца.
**9.00, 21.20** Тэлебарометр.
**9.05, 17.55 Серыял «Жураў».**
**10.15** Навіны надвор'я.
**10.45, 0.15** Дак. серыял «Пад сонцам».
**11.45, 23.25 Серыял «Следства вядзе Да Вінчы».**
**12.50 Маст. фільм «Свой сярод чужых, чужы сярод сваіх».**
**14.45 Драма «Фінішная прамая».**
**16.45** Беларуская часінка.
**19.00 Кінааповесць «Ваўкі».**
**21.25** Футбол. Адборачны матч U-21. Беларусь — Францыя. У перапынку: **22.15** КЕНО.

### БЕЛАРУСЬ 3

**8.00, 12.00, 16.00, 23.30** «Мой горад». Камянец.
**8.20, 18.20** «Лабірынты». Святыя азёры.
**8.50 «Незнаёмая песня». Кароткаметражны фільм.**
**9.25** «Сляды на асфальце». Дак. фільм.
**9.40** «Скарбніца Берасцейшчыны». Беларускі Версаль.
**10.05** «Сакрэтны кінематограф». Фільмы першы, другі і трэці.
**11.30** «Калі мне было восем гадоў...». Дак. фільм.
**12.15 «Іван». Мастацкі фільм.**
**13.25** «Уладзімір Цэслер. Чыз!». Дак. фільм.
**13.55** «Найменні і вобразы». Творчасць народных майстроў-разьбяроў.
**14.10** «Зроблена!» Кінавытворчасць.
**14.40** «У рэху імені твайго...». Пра жонку Францыска Скарыны Маргарыту Адвернік.
**14.55** «Мусаргскі: «Наперад да новых берагоў!» Дак. фільм.
**15.15** «Матэрыя вобраза». Дак. фільм.
**15.45** «Палескі пачастунак». Пірог са шчаўем і запечаны шчупак.
**16.20, 21.55 «Уваскрэсенне». Маст. фільм. 1-я серыя.**
**17.55** «Пад крылом анёла». Дак. фільм.
**18.45** «Давеку». Дак. фільм.
**19.10** «Карані». Справы сямейныя.
**19.35** «Народныя промыслы Расіі». Дымкаўская карусель.
**20.05** «Праўдзівая гісторыя кінамузыкі». Гісторыя савецкай кінамузыкі. Фільм першы.
**20.30** Калыханка.
**20.45 «Факір на гадзіну». Камедыя.**

### АНТ

**6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** Контуры.
**10.05** «Жыць здорава!».
**11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**11.10 Серыял «Закрытая школа».**
**12.10 Серыял «Жаночы доктар 2».**
**13.10** «Добрага здаровейка!».
**13.55** «Модны прыгавор».
**15.00** «Вольф Месінг: які бачыў скрозь час».
**16.15 Серыял «Хатняя прыслужніца».**
**16.55** «Давай пажэнімся!».
**18.20** «Адваротны адлік». «Скарбы Радзівілаў. Згублены след».
**19.00** «Чакай мяне».
**20.00** Час.
**21.05 Серыял «Маці-і-мачаха».**
**22.15 Серыял «Цюдоры».**
**0.15 Камедыя «Сястрычкі Бэнгер».**
**1.55** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 10.25, 13.50, 18.30, 23.00** Дзённік «ХороШоу».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**8.30** «Тыдзень».
**9.40** «Вялікае снеданне».
**10.40, 17.30** «Званая вячэра».
**11.35 «Слова жанчыне». Серыял.**
**12.30** «Джэймі: абед за 30 хвілін».
**13.00** «Жанчыны XX стагоддзя». «Мата Хары — імя агульнае».
**13.55** «Вялікі горад».
**14.30** «Зорны рынг». Дайджэст. «Пачаткоўцы» супраць «прафесіяналаў».
**15.35** «Іншая краіна». «Аб'яднаныя Арабскія Эміраты: «Не нафтай адзінай».
**16.20** «Наша справа».
**16.50** «Па законе».
**17.20** «Міншчына».
**18.35** «Падманутыя навукай».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Добры вечар, малы».
**20.30 Маст. фільм «Шчыгрынавая скура».**
**23.05** «Ваенная тайна».
**0.45** Фінал IX Міжнароднага конкурсу эстрадных выканаўцаў «Усходні базар».

### МІР

**5.00 Серыял «Агонь кахання».**
**6.40** М/ф.
**7.05** «Цік-так».
**7.20 Серыял «Заручальны пярсцёнак».**
**9.00, 12.00, 15.00, 18.00, 21.00** Навіны Садружнасці (бягучы радок).
**9.10 Маст. фільм «Без права на памылку».**
**10.50** «Разам».
**11.45** «Агульны рынак».
**12.25, 2.30 Серыял «Клон».**
**15.25, 22.30** Ток-шоу «Слова за слова».
**16.20 Серыял «Апошні сакрэт Майстра».**
**18.25** «Беларусь сёння».
**19.00 Серыял «Закон і парадак».**
**21.25** «Акцэнты».
**21.40** Дак. фільм «Эпоха. Падзеі і людзі».
**23.25 Серыял «Прыватны дэтэктыў».**
**1.00 Маст. фільм «Самыя шчаслівыя».**

### РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00** «Раніца Расіі».
**10.55** Надвор'е на тыдзень.
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Ранішняя@пошта».
**12.00** «Прамы эфір».
**13.00** «Асаблівы выпадак».
**13.50, 16.50, 19.50, 23.30** Навіны — Беларусь.
**14.30** «1000 дробязяў». Ток-шоу.
**15.10** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
**15.55, 17.10 Серыял «Кацярына. Сям'я».**
**18.05 Серыял «Ефрасіння. Таежнае каханне».**
**18.55 Серыял «Тайны інстытута высакародных дзяўчат».**
**20.40 Серыял «Кацярына. Іншае жыццё».**
**22.30 Серыял «Прынцып Хабарава».**
**23.40** Сведкі. «Прыходзіцца быць моцнай. Таццяна Дароніна». Фільм 1-ы.

### НТБ—БЕЛАРУСЬ

**6.00** «НТБ раніцай».
**8.40, 10.20 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**11.00** «Да суда».
**11.55** «Суд прысяжных».
**13.25** «Суд прысяжных. Канчатковы вердыкт».
**14.25** «Справа ўрачоў».
**15.15** «І зноў прывітанне!».
**15.40, 18.35** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**16.25** «Пракурорская праверка».
**17.40** Ток-шоу «Гаворым і паказваем».
**19.35 Серыял «Бамбіла. Працяг».**
**21.20 Серыял «Мянтоўскія войны».**
**23.05** Сёння. Вынікі.
**23.30 Серыял «Карпаў».**

### 8 КАНАЛ

**7.00, 12.15, 18.35, 21.00, 23.45** «Надвор'е».
**7.05** «На рыбалку».
**7.20** М/с.
**7.30, 14.30 Серыял «Цудоўнае стагоддзе».**
**9.15, 17.45 Серыял «Дзённікі вампіра».**
**10.00 «Сінематограф». Маст. фільм «Місіс Мінівер».**
**12.20 Трылер «Джэк Рычар».**
**16.10** Мультпарад «Легенда пра Тарзана».
**16.30** «Мой любімы гадаванец».
**17.00 Серыял «Тайныя сувязі».**
**18.40 Серыял «Белая каралева». 1—2-я серыі.**
**20.50** «Вечарніца».
**21.05 Драма «Аперацыя нумар адзін».**

### ВТБ

**6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 1.00** «PLAY».
**8.00, 14.00, 18.00** Скетч-шоу «6 кадраў».
**8.30, 17.30** «С.У.П.».
**9.00** «Жонкі алігархаў».
**10.00 Серыял «Метад Лаўровай».**
**11.00, 22.20 Серыял «Маргоша».**
**12.00** Скетч-шоу «Адны дома».
**12.30** «Куды прыводзяць мары».
**13.00, 16.30** Скетч-шоу «Анекдоты».
**13.30, 17.00** Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
**14.30, 23.30** «Улётнае відэа».
**15.00 Серыял «Крамлёўскія курсанты».**
**16.00, 18.30** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**19.00 Серыял «Метад Лаўровай-2».**
**20.00 Серыял «Кухня».**
**21.10 Серыял «Дзённік доктара Зайцавай».**
**0.00** «Дарожныя войны».
**0.30** «Ч.П?».

### ІНТЭР+

**7.00, 7.30, 8.00, 8.30, 9.00, 12.00** Навіны.
**7.10, 7.35, 8.10, 8.35** Раніца з ІНТЭРам.
**9.10, 22.45** Легенды крымінальнага вышуку.
**9.50, 16.15, 0.50** Судовыя справы.
**10.30, 16.55, 1.30** Сямейны суд.
**11.15, 18.30 Серыял «Маршрут міласэрнасці». 1-я серыя.**
**12.20 Серыял «Анёл-ахоўнік».**
**13.05, 23.15 Серыял «Суседзі». 1-я серыя.**
**13.30, 0.05** Тэлефон даверу.
**14.20 Серыял «Жыццё як жыццё». 1-я серыя.**
**15.00, 23.45, 6.35** Дак. серыял «Жывое багацце Украіны».
**15.20** Арол і рэшка.
**17.40, 4.15** Давай пажэнімся!
**19.15, 2.15** Ток-шоу «Датычыцца кожнага».
**20.00, 3.00** Падрабязнасці.
**20.30, 5.05** Давай пажэнімся ва Украіне.
**21.15, 3.30 Серыял «Аднойчы будзе каханне». 1-я серыя.**
**22.00, 5.50 Серыял «Я прыйду сама». 1-я серыя.**

### НАСТАЛЬГІЯ

**5.00** «Быў час». 2009 год.
**6.00** «Начная феерыя». Канцэртная праграма. 1995 год.
**7.20** «КВЗ-89». Другая гульня сезона. 1989 год.
**9.00** «Вы ўмееце іграць на піяніна?». Тэлеспектакль. 1982 год.
**10.30** «Аўтограф па суботах». 1993 год.
**11.00** «У суботу... у Рызе». Музычна-забаўляльная праграма. 1984 год.
**12.00, 3.00** «Колба часу».
**13.00** «Хроніка адной рэпетыцыі». 1973 год.
**14.00** «Перад стартам». Канцэртная праграма. 1984 год.
**15.05** «Тэатральныя сустрэчы». 1981 год.
**16.40** «Наш адпачынак». Дак. фільм.
**17.00** «Будзільнік» «Часопіс «Вожык». 1988 год.
**17.35** «Мелодыі і рытмы маладосці». 1980 год.
**18.00** «Школа чэмпіёна». Дак. фільм.
**18.30 «Палёт пачынаецца з зямлі». 1-я серыя. Маст. фільм.**
**19.35** «Ненармальная. Хроніка аднаго адпачынку». Дак. фільм.
**20.00, 2.00** «Час».
**21.00** «Народжаныя ў СССР».
**22.00** «Сустрэча з Васіліем Ланавым у канцэртнай студыі «Астанкіна». 1983 год. 1-я частка.
**23.00** «Экспедыцыі ў Гімалаі». Дак. фільм. 1989 год. Фільм другі.
**0.00** «Ранішняя пошта» ва Угліччы.
**0.40 «Інспектар Гул». Маст. фільм.**
**4.00** «Кінапанарама» «Паралельнае кіно». 1988 год.

### EUROSPORT

**9.30** Мотаспартыўны ўікэнд.
**9.45, 16.00** Веласпорт. Вуэльта.
**11.00** Конны спорт. Вялікі шлем.
**12.00** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе Турынг.
**12.45, 18.45, 22.00** Тэніс. Адкрыты чэмпіянат ЗША.
**14.30, 20.15** Тэніс. Адкрыты чэмпіянат ЗША. Жанчыны. Фінал.
**21.45** Вось гэта дзіва!!!
**0.00** Гейм, сэт і Матс.
**0.05** Тэніс. Адкрыты чэмпіянат ЗША. Мужчыны. Фінал.

### КАМЕДЫЯ

**5.00, 10.55, 17.00, 19.00, 2.05** «Паміж намі».
**5.15, 21.00, 2.20** Серыял «Гэта ўсё пра Джаан».
**6.00, 10.40, 21.50, 3.05** «Камедыянты. Лепшае».
**6.15** Маст. фільм «Гаспадар у доме».
**8.00, 12.55, 16.00** Серыял «Старыя перцы».
**9.00** Камедыя «Дзякуй тата, дзякуй мама».
**11.15** Камедыя «Кароль Ральф».
**14.05** Камедыя «Філадэльфійская гісторыя».
**17.20** Камедыя «Я не ведаю, як яна робіць гэта».
**19.20** Камедыя «Джым з Пікадзілі».
**22.10** Камедыя «Руганціна».
**0.10** Камедыя «І ў беднасці, і ў багацці».
**3.20** Мюзікл «Дарога ў Рыа».

### ДЗІЦЯЧЫ СВЕТ

**2.00, 8.00, 14.00** Маст. фільм «Том Соер».
**3.20, 9.20, 15.20** М/с «У гасцях у дзеда Яўлампія. Супастат». Фільм 1. Зборнік м/ф «Ахвотнік да казак». «Вясёлая карусель» № 20. «Вітамін росту».
**4.00, 10.00, 16.00** М/с «Чорны пірат». Казкі рускіх пісьменнікаў. «Малахітавая шкатулка». М/ф «Жыхары старога дома».
**5.00, 11.00, 17.00** Кінанавела «Пра што не даведаюцца трыбуны». М/ф «Жвавы».
**6.30, 12.30, 18.30** М/с «Хрыстафор Калумб».
**7.00, 13.00, 19.00** «Урокі цётачкі Савы». Зборнік м/ф «Бацькава навука». «Вій».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**7.55, 21.10** «Пелагія і белы бульдог». Серыял.
**8.45, 18.30, 2.55** «Цудоўнае стагоддзе». Серыял.
**10.45, 17.00** «Паралельны свет». Дак. серыял.
**11.45, 16.00** «Варажбітка». Дак. серыял.
**12.45, 18.00** «Паляўнічыя на прывідаў». Дак. серыял.
**13.15** «Дабрыня Нікіціч і Змей Гарыныч». М/Ф.
**14.15, 23.45, 4.30** «Менталіст». Серыял.
**20.15** «Контргульня». Серыял.
**22.10** «5 пальцаў». Маст. фільм.
**1.15** «Звышнатуральнае». Серыял.
**2.00** «Паляўнічыя на чужых». Серыял.

### ТБ1000

**5.00** Драма «Жыццё па Джэйн Осцін».
**7.00, 23.00** Меладрама «Каханне, якое збівае з ног».
**9.00** Драма «Пасажыры».
**11.00** Камедыя «Ідэальны мужчына».
**13.00** Драма «Доказ».
**15.00** Фэнтэзі «Уладар пярсцёнкаў: Брацтва пярсцёнка».
**18.30** Драма «У пагоні за шчасцем».
**20.45** Драма «Апусцелы горад».
**0.50** Драма «Павуціна хлусні».
**3.10** Трылер «Готыка».

### ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

**6.00** Драма «Водпуск у верасні».
**9.00** Маст. фільм «Прыгоды Шэрлака Холмса і Доктара Ватсана. XX стагоддзе пачынаецца».
**12.00** Драма «Дон-Кіхот».
**14.00** Камедыя «Стэп бай стэп».
**16.00** Меладрама «Свой — чужы».
**18.00** Камедыя «У Расію па каханне!».
**20.00** Камедыя «Пра што гавораць мужчыны».
**22.00** Камедыя «Пра што яшчэ гавораць мужчыны».
**0.00** Меладрама «Белая сукенка».
**2.00** Камедыя «Разгільдзяй».
**4.00** Трагікамедыя «Пяць зорак».

### NATIONAL GEOGRAPHIC

**5.00, 21.00, 1.00, 4.00** Ліхтугі за мяжой.
**6.00** Паляўнічы на прэснаводных гігантаў.
**7.00, 10.00** У пошуках гіганцкага васьмінога.
**8.00, 13.00** Дзікі тунец.
**9.00, 14.00** Каралі рыбалкі.
**11.00, 23.00** Уцёкі.
**12.00, 18.00** Машыны: разабраць і прадаць.
**15.00** У пошуках акул.
**16.00** Армія ласасёвых акул.
**17.00, 2.00** Апошнія тайны Трэцяга рэйха.
**19.00, 0.00, 3.00** Міжнародны аэрапорт Дубай.

### DISCOVERY

**7.00, 16.25** Самагоншчыкі.
**7.50, 12.20, 3.05** Выжыць разам.
**8.40, 20.05** Як гэта ўстроена?
**9.10, 20.35, 4.45** Як гэта зроблена?
**9.35, 17.20** Паляўнічыя на рэліквіі.
**10.30** Экспрэс-курс з Рычардам Хэмандам.
**11.25, 3.55** Разбуральнікі легенд.
**13.15, 0.55** Top Gear.
**14.10, 6.05** Махінатары.
**15.05** Пятая перадача.
**15.30, 5.10** Зброя, якая змяніла свет.
**18.15** Паўночная Амерыка.
**19.10** Лепшы рыбалоў.
**21.00** Палёты ўглыб Аляскі.
**22.00** Паветраныя дальнабойшчыкі.
**23.00** Голыя і напалоханыя.
**0.00** Поўны дапаможнік па прышэльцах.
**1.50** Вернер Херцаг: шлях смяротніка.
**2.40** Маланкавыя катастрофы.

# КАМП'ЮТАР МЫ КУПІЛІ ЗА ДЭКРЭТНЫЯ ГРОШЫ...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

44-гадовы Уладзімір Юркевіч працуе трактарыстам-машыністам у СВК «Горталь», 33-гадовая Таццяна — аператарам машыннага даення на ферме ў той жа гаспадарцы. Звычайная дружная і працавітая беларуская сям'я. І будні ў іх звычайныя, і клопаты.

— Я ўстаю на працу а палове пятай раніцы, бо ў пяць гадзін ужо пачынаецца дойка. Працую дзесьці да дзевяці, вось як сёння, — усміхаецца Таццяна. — Прыязджаю дадому, і ўсе разам снедаем. Як правіла, мы гатуем сняданак з вечара, а раніцай толькі разаграваем. Звычайна гэта нешта з бульбы: дзеці яе вельмі любяць. Мы яе і варым, і смажым, і парым... Да бульбы падаём салаты або выкарыстоўваем хатнія нарыхтоўкі , купляем каўбасу ці яшчэ што-небудзь. Па заведзеным парадку гатаванне сняданка ляжыць на дзяўчынках — яны ўжо вялікія ў нас.

А ўжо пасля я гатую абед. Потым раблю розныя справы па гаспадарцы. Увечары, а пятай, зноў іду на працу, а Вераніка і Алеся застаюцца за старэйшых. Вераніка паступіла сёлета ў Брэсцкі ўніверсітэт. Так што цяпер за старэйшую будзе Алеся... Вечарам вяртаецца з працы муж і таксама сядзіць з дзецьмі. Ці дапамагаюць дзеці? Дапамагаюць, вядома. Агароды, бульба — усе работы робім разам...

### НАМ ПАБУДАВАЛІ ДОМ МЕНАВІТА ТАК, ЯК МЫ ХАЦЕЛІ...

Год таму сям'я Юркевічаў засялілася ў новы дом. Гэта аказалася магчымым дзякуючы таму, што сям'я атрымала льготны крэдыт, а прадпрыемства дало бязвыплатную субсідыю.

— На першым паверсе ў нас гульнявая, зала і кухня, кладоўка. На другім — чатыры пакоі і ванная, — паказвае гаспадыня. «Мы задаволеныя сваім домам. Яго так акуратна пабудавалі», — у адзін голас гавораць муж і жонка.

— Мы пражылі ў ім год, і ўсё пытаюць мяне: што ты хацела б памяняць у доме? — усміхаецца Таццяна. — А я нічога не хачу мяняць! Нам пабудавалі яго менавіта так, як мы хацелі.

— Напэўна, камунальныя плацяжы шмат «цягнуць»? — цікаўлюся. — Усё ж такі 206 квадратных метраў!

— Мы плацім толькі за святло, — махае рукамі Таццяна. — Вада ў нас свая (падаецца са сваёй калонкі), ацяпленне таксама сваё (кацёл паляць дровамі, якія самі нарыхтоўваюць), так што застаецца толькі адзін плацеж!

— Ну, а хто камандуе ў доме?

У адказ усе смяюцца: «Усе камандуюць, але больш за ўсіх — мама», — гавораць. «Мама і тата камандуюць у асноўным», — сур'ёзна дапаўняе 8-гадовая Волечка.

### НЕ БЫВАЕ БЕЗ ЛЫЖКІ ДЗЁГЦЮ

— Афармлялі крэдыт два гады — і год будавалі дом, — Таццяна перарываецца на хвілінку, каб наліць малодшаму сыну малака. — Пакуль я збірала розныя дакументы, бывала, па тры разы на тыдзень даводзілася ў райцэнтр ездзіць. Іншы раз і ў слязах вярталася...


Вярэнька — карзіна з лубу.

Сказаць, што жыццё гэтай сям'і — суцэльны мёд, было б няправільным, ды так і не бывае... У нашай дзяржаве прыняты добрыя законы, якія дапамагаюць шматдзетным сем'ям, вось толькі на месцах іх выконваць не заўсёды спяшаюцца. Таццяна са сваімі справядлівымі патрабаваннямі мясцоваму кіраўніцтву, мабыць, ужо надакучыла. Але думаць, што яна толькі абівае парогі ў пошуках ільгот, было б няправільна. У гэтай сям'і разлічваюць перш за ўсё на сябе. І вельмі шмат працуюць.


Дом Юркевічаў самы вялікі ў вёсцы.

— Я выйшла на працу, калі Максіму было паўтара года, — успамінае Таццяна. — Прычына простая: не хапала грошай. Памятаю, мы селі ўсёй сям'ёй (як мы кажам, сабралі сход) — і вырашылі, што я выходжу працаваць, а на старэйшых дзяцей кладзецца адказнасць за малодшых. Усе тады пагадзіліся...

### ТАКІЯ РОЗНЫЯ ДЗЕЦІ

Усе дзеці ў гэтай сям'і, як яно звычайна і бывае, розныя: Алеся вельмі актыўная, шустрая. Вераніка больш спакойная, разважлівая, самастойная. Саша трохі запаволены: скажаш яму нешта, дык ён адразу не зробіць, спачатку падумае... А Максім самы дапытлівы: яму ўсё цікава, усё трэба памацаць, усё ўбачыць і пра ўсё даведацца.

Вераніка амаль паўтара мільёна сёлета зарабіла, здаючы ягады, і гэта нягледзячы на тое, што асноўная частка лета была ў яе занятая паступленнем ва ўніверсітэт. «Збірала па 30 літраў за дзень у вярэньку — гэта такая каробка сплеценая з лубу, з сасны, напрыклад. Для гэтага калісьці людзі ездзілі ў лес, нарыхтоўвалі сасну, рэзалі яе на кавалкі і рабілі тонкія, як кардон, палоскі, трохі прасушвалі і плялі з іх вось такія вярэнькі», — паказвае нешта накшталт плеценай карзіны Таццяна.

❑ ❑ ❑

У рэдкую вольную хвіліну Таццяна любіць пасядзець з кнігай (аддае перавагу любоўным раманам), муж лепш паглядзіць кіно, а дзеці, вядома ж, любяць камп'ютар.

— Камп'ютар мы купілі за дэкрэтныя грошы, якія я атрымала за Максіма. За дэкрэтныя на Сашу набылі пральную машыну. Было так: ведаеш, што атрымаеш буйную суму, і імкнешся зрабіць нейкую вялікую пакупку, — раскрывае сакрэты сямейнай эканомікі Таццяна.

❑ ❑ ❑

Тут да маці падлятае Волечка: «Мама, мне Саша сукенку тузае!» Але рэагуе на скаргу не мама, а Вераніка, якая напаўгалос пачынае разбірацца са свавольнікамі. «Ідзі пагуляй», — ціхенька раіць яна малодшаму браціку. Той у адказ толькі ўсміхаецца: ісці з пакоя, дзе ўсе размаўляюць, яму не хочацца...

### МЕНАВІТА З ІХ ЗАРПЛАТ БУДУЦЬ ІСЦІ АДЛІЧЭННІ НА НАШУ З ВАМІ ПЕНСІЮ

У наш час нярэдка можна сустрэцца з думкай, што дазволіць сабе шмат дзяцей могуць хіба што алігархі накшталт Рамана Абрамовіча. А калі ў вас няма вялікіх грошай, маўляў, не трэба пладзіць галечу. Гэта і праўда, і няпраўда. Алігархі тут, як і колькасць грашовых знакаў, вядома ж, не прычым. Праўда, напэўна, у тым, што людзі, якія адважыліся мець шмат дзяцей, павінны быць моцнымі і працавітымі. Інакш з гэтай задумы нічога добрага не атрымаецца.

Яшчэ адна распаўсюджаная думка, якую тут жа выказала мне сяброўка, калі я расказала ёй пра сям'ю Юркевічаў: чым больш дзяцей, тым яны, як правіла, дружнейшыя. І гэта таксама — і праўда, і няпраўда. Чаму? Таму што нічога не прыходзіць само сабой, і каб дзеці раслі дружнымі, над гэтым трэба добра папрацаваць іх бацькам.

— Калі Вераніка была адзінай, а потым з'явілася Алеся, спачатку было цяжка, — успамінае Таццяна Юркевіч. — Старэйшая дачка раўнавала мяне да меншай, не хацела нічым дзяліцца. Давялося доўга тлумачыць, што маленькую сястрычку трэба любіць і клапаціцца пра яе. Потым, чым больш станавілася дзяцей у сям'і, тым прасцей ужо было выхоўваць у іх імкненне клапаціцца адзін пра другога. Зараз усе адно з адным дзеляцца, усе дружна гуляюць разам, ніхто не б'ецца.

❑ ❑ ❑

...Вось такая гэтая сям'я. Цяпер шмат у каго ў нашым грамадстве пануе думка: маўляў, некаторыя любяць нарадзіць як мага больш дзяцей, а потым толькі і робяць што чакаюць ільготаў для сябе. А мы, маўляў, павінны працаваць і адлічваць на іх падаткі. Але давайце не забываць, што дзеці — гэта будучыня краіны і наша будучыня. І больш празаічнае — калі гэтыя дзеці вырастуць, менавіта з іх зарплат будуць ісці адлічэнні на нашу з вамі пенсію.

**Святлана БУСЬКО. Фота аўтара.**

■ Запрашальнік

# УСЕ — У НАВАГРУДАК

**«Навагрудскі замак — 2013» — міжнародны фестываль культуры сярэднявечча. З 6 па 7 верасня мерапрыемства адбудзецца ў першай сталіцы ВКЛ.**
**У Румыніі, Чэхіі і Германіі святы такога кшталту ладзяцца даволі даўно. У Беларусі — з 2000 года і толькі ў Навагрудку. Як-ніяк тысячагадовая гісторыя горада (заснаваны ў 1044-м) ідэальна адпавядае канцэпцыі фестывалю. Сёлетні — стане шостым.**

### Хто прыедзе?

300 рыцараў і артыстаў дапамогуць перанесці жыццё Навагрудка ў святочную атмасферу сярэднявечча. З'едуцца больш як 20 рыцарскіх клубаў з Беларусі, Расіі, Украіны і Польшчы. Сярод іх — «Арыдан», «Рускі сцяг», «Фенікс», «Азгард», «Дзікае паляванне».

Навагрудак сустрэне і лучнікаў, і акцёраў, і танцораў, і мноства музычных калектываў.

### Што чакаем?

7 верасня ўрачыстым ходам рыцараў з дамамі іх сэрцаў пачнецца асноўная частка імпрэзы. Героі ў касцюмах эпохі сярэднявечча рушаць ад лагера, што будзе знаходзіцца каля падножжа Замкавай гары, да цэнтральнай плошчы горада. Пасля адбудзецца не менш урачыстае адкрыццё фестывалю, а таксама знаёмства з рыцарскімі клубамі. Апошняе закончыцца першым паядынкам. А затым — масавыя рыцарскія баі як сімвалічнае адлюстраванне абароны сцен Навагрудскага замка.



У гэты ж дзень чакаем турнір лучнікаў, які арганізуе Гільдыя лучнікаў Беларусі. Шэраг вогненных шоу ад кіеўскага тэатра гістарычнага танца «Альентрада» ўпрыгожаць мерапрыемства таксама. Як толькі пачне вечарэць, дзеянні перанясуцца на галоўную гарадскую сцэну. Менавіта там карануюць Міндоўга. Своеасаблівая інаўгурацыя караля — грандыёзная тэатралізаваная пастанова, максімальна набліжаная да рэчаіснасці. Пастанова зменіцца святочным канцэртам, сярод удзельнікаў якога — рок-групы «Jahkey» і «Aillion», беларускі спявак Пётр Ялфімаў. А далей — наймаштабнейшае фаер-шоу.

8 верасня госці і жыхары Навагрудка ўбачаць конны рыцарскі турнір, падрыхтаваны лепшымі рыцарамі не толькі Беларусі, але і замежжа. Можна будзе пазнаёміцца з паказальнымі выступленнямі лучнікаў, пераняць штосьці дзякуючы танцавальным майстар-класам. Затым — канцэрт-шоу «Развітанне з легендай».

Штурм Замкавай гары — гэта заўжды кульмінацыя.

### Што было на мінулых фестывалях?

Ключавой падзеяй першага мерапрыемства стала навала тэўтонскіх рыцараў (бой датуецца 1394 годам), другога — каранацыя Міндоўга. Трэці ж фестываль меў 2 этапы: спачатку маштабная музычная імпрэза, затым — рыцарскі турнір. Былі і фестывалі, прысвечаныя сярэдневяковай кухні і рамёствам, рыцарскім клубам з Беларусі, Расіі, Украіны, Літвы і Чэхіі. У 2010 годзе паспяхова рэканструявалі Грунвальдскую бітву.

### Чаму можна парадавацца?

Рыцарскі лагер каля падножжа Замкавай гары. Ператварэнне рова ў рысталішча для выдатных наезнікаў. Апошняе — надзвычайна цікавы складнік фестывалю: конныя рыцары дэманструюць выпрацаваныя навыкі. Калі пашанцуе, можна ўбачыць славутае практыкаванне «ўдар сарацына», якое крыжакі прывезлі з Палесціны. Яго сутнасць у наступным: на поўным ходзе наезнік кап'ём патрапляе ў невялікі рухомы шчыт, дзе на адваротным боку замацаваны даволі цяжкі груз. Рыцару неабходна не толькі патрапіць у мішэнь, але і паспець адхінуцца ад грузу. Не адхінешся — груз паляціць на цябе. У любым выпадку публіка застанецца ў захапленні.

На цэнтральнай плошчы — менестрэлі сярэднявечча. Адважныя воіны змагаюцца між сабой за права лічыцца лепшымі ў валоданні мяча.

...Блізіцца ноч. Навагрудскі фестываль толькі набірае абароты. Запальваюцца факелы. Гарадское жыццё актывізуецца напоўніцу.

**Маргарыта СІДАР**

■ Нататкі падарожніка

# Швейцарыя і Францыя пад... Мінскам

Сядзіба ў Прылуках, якую калісьці «выратаваў» каларадскі жук.



**Многія краіны і гарады даўно ўжо абзавяліся так званымі «залатымі коламі». Нарэшце з'явілася сваё «кола» і ў Мінска, і па ім сярод першых праехала карэспандэнт «Звязды». Распрацоўшчык унікальнай экскурсіі вакол сталіцы Павел Каралёў папярэдзіў, што маршрут яшчэ не «абкатаны». «У перспектыве ў кожным пункце плануецца паставіць стэнды з апісаннем месца і картай, якая б паказвала, што гэта менавіта «кола». Такім чынам усе ахвотныя самі змогуць здзейсніць сваё падарожжа вакол горада», — распавёў экскурсавод. У наш першы і ад таго ўдвая больш захапляльны вояж увайшлі восем пунктаў, і гэта далёка не ўсё, што можна ўключыць у «Мінскае кола».**

### СПАДЧЫНА СЛАВУТАГА АГРАНОМА

Мы выязджаем у накірунку Слуцка і прыкладна праз 20 кіламетраў аказваемся ля шыкоўнага старажытнага парку ў былым маёнтку Ігнатычы, які цяпер мае «савецкую» назву Калініна. Тут захавалася сядзіба роду Ельскіх. На ўваходзе на яе тэрыторыю нашу экскурсійную групу сустракаюць брэхам два барбосы — маёнтак сёння належыць прыватнаму расійскаму ўладальніку. Тым не менш нам дазволілі прагуляцца па парку, агледзець будынак сядзібы і флігель.


Павел Каралёў паказвае, як выглядала сядзіба Тышкевічаў у Лагойску.

Ігнатычамі валодалі розныя шляхецкія роды, з 1857 па 1863 год маёнтак знаходзіцца ва ўласнасці Уладзіміра Ельскага. Гэта быў выдатны чалавек: навучаўся ў Сарбоне, ведаў 10 замежных моў і за шэсць гадоў завёў добрую гаспадарку. Але за ўдзел у паўстанні 1863—64 гадоў Уладзімір Ельскі быў сасланы ў Чалябінск, пасля чаго пераехаў у Францыю. Ужо яго сын Вільгельм у XIX стагоддзі пабудаваў драўляную сядзібу, якая да нашых дзён не захавалася. Эклектычная камяніца, якую можна ўбачыць цяпер, была ўзведзена ў 1914 годзе як дадатковая і выкарыстоўвалася для экспанавання твораў мастацтва, якія збіраў гаспадар. Вядома, што столь у гэтай сядзібе была выкладзена мазаікай, а ўсе каміны былі розных колераў. Апроч таго, Вільгельм быў вядомым аграномам, і паркавы масіў у Ігнатычах, вядомы як гадавальнік Ельскага, узнік дзякуючы яму. Тут вырошчваліся самыя рэдкія і экзатычныя пароды дрэў і раслін, якімі любіла аздабляць свае маёнткі навакольная шляхта. Дарэчы, дзякуючы Вільгельму Ельскаму на тэрыторыі Беларусі распаўсюдзіўся лубін; адных толькі ружаў у гадавальніку было больш за 400 гатункаў, а бэзу — каля 16. Можна толькі здагадвацца, якога маштабу быў гэты сад, калі яшчэ цягам 30 гадоў пасля рэвалюцыі азеляненне Мінска ажыццяўлялася за кошт яго.

### ФРАНЦЫЯ Ў БЕЛАРУСКІМ МЯСТЭЧКУ

Пасля Ігнатычаў наш шлях ляжыць у Смілавічы. Спачатку мястэчка належала Агінскім, якія пабудавалі тут у XVII стагоддзі замак. Пасля яго выкупіў Станіслаў Манюшка — дзед вялікага кампазітара — і на пачатку XIX стагоддзя стварыў на месцы замка сядзібу. Затым маёнтак перайшоў да роду Ваньковічаў (яны ў 1900-х гадах зрабілі прыбудову, якая гарманічна спалучылася з ранейшым будынкам). Палац захаваўся да нашых дзён у параўнальна нядрэнным стане (магчыма, дзякуючы таму, што ў адным з яго карпусоў размяшчаўся аграрны каледж), хоць самая старая яго частка значна пашкоджана. Цяпер комплекс рыхтуюць да рэстаўрацыі.

Існуе легенда, што апошні ўладальнік маёнтка Леан Дамінік Ваньковіч прыкмеціў хлопчыка, у якога былі здольнасці да мастацтва, і падарыў яму фарбы. Гэтым хлопчыкам быў Хаім Суцін, які нарадзіўся ў Смілавічах і якому наканавана было стаць сусветна вядомым прадстаўніком Парыжскай школы мастакоў. Памяць пра вялікага земляка захоўваецца ў смілавіцкім цэнтры дзіцячай творчасці, дзе ў 2008 годзе па ініцыятыве ЮНЕСКА была створана экспазіцыя «Прастора Хаіма Суціна». Выстава складаецца з дзвюх залаў: першая распавядае пра жыццё мастака ў Беларусі, другая прысвечана парыжскаму перыяду. У зборы — фотаздымкі, рэпрадукцыі карцін Суціна, артыкулы пра мастака і шмат іншага. Сапраўднай «разынкай» з'яўляецца афармленне другой залы ў выглядзе парыжскай кавярні са столікамі, дзе наведнікаў частуюць кавай, зваранай па лепшых французскіх рэцэптах, і паказваюць фільм пра Хаіма Суціна. Шчыра кажучы, раней да творчасці гэтага мастака я ставілася халаднавата, але атмасфера музея наблізіла мяне да яе разумення. Натхнёная, я нават набыла сабе на памяць забаўны фотаздымак Хаіма Суціна, дзе ён разам з невядомай мне жанчынай трымае за пярэднія лапы сабаку.

**Існуе легенда, што апошні ўладальнік маёнтка Леан Дамінік Ваньковіч прыкмеціў хлопчыка, у якога былі здольнасці да мастацтва, і падарыў яму фарбы. Гэтым хлопчыкам быў Хаім Суцін, які нарадзіўся ў Смілавічах і якому наканавана было стаць сусветна вядомым прадстаўніком Парыжскай школы мастакоў.**

### НАД ХВАЛЯМІ ЛАГОДНАЙ ГАЙНЫ

Са Смілавіч, наведаўшы Свята-Дабравешчанскую царкву ў вёсцы Малыя Ляды, мы выязджаем на Лагойск. «Беларуская Швейцарыя», як завуць Лагойшчыну, уражвае сваімі маляўнічымі краявідамі, чаргаваннем узгоркаў і лагчын. Паводле адной з версій, назва самога гарадка пайшла ад слова «лог» — месца паміж узгоркаў.


У смілавіцкім музеі Хаіма Суціна нават сервіз тэматычны.



У горадзе высокія замкавыя валы некалі былі акружаныя ровам. У XIX стагоддзі тут была створана сістэма каскадаў, па якіх струменіла вада з ракі Гайны. Нават цяпер, калі роў ужо высах, каменныя парогі і масткі, зарослыя травой, выглядаюць надзвычай прыгожа.

Тут жа, на замкавай гары, стаяць руіны калісьці велічнай сядзібы Тышкевічаў. Паўтары сотні гадоў таму дзякуючы гэтаму роду і, у прыватнасці, братам Канстанціну і Яўстаху, Лагойск быў вядомы ўсяму свету як адзін з цэнтраў навукі і культуры. Лагойскі музей старажытнасцяў, створаны братамі Тышкевічамі ва ўласнай сядзібе ў 1846 годзе, быў першым публічным музеем на тэрыторыі нашай краіны. Яго зборы былі настолькі багатыя, што вядомы даследчык Адам Кіркор параўноўваў іх з віленскім і кракаўскім музеямі. Старадрукаваныя кнігі, больш за тысячу старажытных грамат, калекцыя медалёў і манет, зброя, карты, аўтографы, малюнкі, збор старажытных ваз і партрэтаў роду, прадметы раскопак у Пампеях і Егіпце — толькі некаторыя каштоўнасці з яго фондаў. Браты Тышкевічы фактычна былі першымі археолагамі на Беларусі, яны даследавалі шматлікія курганы і замчышчы Лагойшчыны.

Сама сядзіба слынных даследчыкаў прастаяла да Другой сусветнай вайны і была разбурана партызанамі, бо ў ёй размяшчалася нямецкая адміністрацыя.

### У ГАСЦЯХ У АПОШНЯГА МІНСКАГА ВАЯВОДЫ

З Лагойска мы накіроўваемся да маёнтка апошняга мінскага ваяводы Адама Хмары, аднаўленнем якой займаецца наш экскурсавод Павел Каралёў. Славутая Віленская дарога вядзе нас у вёску Сёмкава. На ўездзе з левага боку вачам адкрываецца вялікі старажытны парк плошчай у 10 гектараў. Да самой сядзібы, як і дзвесце гадоў таму, вядзе ліпавая алея. Едучы па ёй, можна памарыць і ўявіць сябе каралём Станіславам Аўгустам Панятоўскім або адным з Песняроў — Янкам Купалам ці Якубам Коласам, якія кожны ў свой час гэтаксама ўязджалі ў маёнтак.

**Да самой сядзібы, як і дзвесце гадоў таму, вядзе ліпавая алея, едучы па якой можна памарыць і ўявіць сябе каралём Станіславам Аўгустам Панятоўскім або адным з Песняроў — Янкам Купалам ці Якубам Коласам, якія кожны ў свой час гэтаксама ўязджалі ў маёнтак.**

Адам Хмара праславіўся на службе ў Сапегаў, за што быў прызначаны 29-ым мінскім ваяводам і атрымаў ва ўладанне Сёмкава, дзе ўзвёў шыкоўную рэзідэнцыю, якую называюць «Сёмкаўскім Версалем». Цяпер дзіўна думаць пра гэта і, стоячы сярод напаўразбураных сцен, усведамляць, што калісьці тут была прасторная бальная зала, у якой у нястомных танцах кружылі кавалеры і дамы... І яшчэ больш дзіўна бачыць, а дакладней, адчуваць носам каналізацыйны сцёк у некалькіх дзясятках метраў ад палаца...

У Сёмкаве ўжо не адзін сезон працуюць валанцёры, якія расчышчаюць тэрыторыю, праводзяць археалагічныя раскопкі і кансервуюць сцены сядзібы. Паўтара года таму яны знайшлі ўнікальную памятную пліту з тэкстам на лацінскай мове, датаваную 1804 годам. Аўтарамі пліты былі Адам Хмара і яго брат, якія такім чынам ушаноўвалі памяць сваіх бацькоў. «Цяпер ведай і памятай, хто б ты ні быў, прачытай гэта і падумай, якім пераменам падлягае ўсё ў свеце, бо і саміх грамадзян, і іх айчыны захоплівае імклівы вір знікнення», — выбіта ўнізе на пліце пасля асноўнага тэксту.

### РЭЗІДЭНЦЫЯ КУБЭ І ПЕРШЫ БЕЛАРУСКІ БАЯВІК

Пасля Сёмкава мы паглядзелі на добра захаваную, але няўдала пафарбаваную (я налічыла ажно 7 колераў!) тыповую шляхецкую сядзібу роду Друцкіх-Любецкіх у вёсцы Новае Поле. Затым гераічна скакалі цераз раку Менку (мастка праз яе няма, нягледзячы на тое, што гэта важны турыстычны аб'ект), уцякалі ад восаў і караскаліся на валы старажытнага Мінскага замчышча ў вёсцы Гарадзішча.

Нарэшце даехалі да апошняга пункта нашага кола — мястэчка Прылукі. Тут у добраўпарадкаваным парку яшчэ растуць двухсотгадовыя дрэвы і ўзвышаецца прыгожы дагледжаны палац. Ён стаіць на месцы праваслаўнага манастыра. Сядзіба доўга пераходзіла з рук у рукі, пакуль не трапіла ва ўладанне Эмерыку Чапскаму, які адрамантаваў будынак і заклаў парк. Чапскія былі апошнімі гаспадарамі маёнтка.

Палац у Прылуках звязваюць з пачаткам беларускага кінематографа, бо менавіта тут у 1926 годзе Юрый Тарыч здымаў, як прынята лічыць, першы беларускі фільм «Лясная быль», які па ўзроўню спецэфектаў можна лічыць баевіком. Вядома, што падчас Вялікай Айчыннай вайны палац быў адной з рэзідэнцый гаўляйтара Беларусі Вільгельма фон Кубэ. Пры адыходзе адсюль немцы падпалілі будынак, і ўсё ўнутры выгарала. Пасля вайны яго аднавілі і размясцілі ў ім лабараторыю па барацьбе з каларадскім жуком. Пазней на яе базе быў створаны інстытут абароны раслін, які і цяпер месціцца ў будынку былой сядзібы.

❑ ❑ ❑

Вяртаючыся назад у Мінск, мы былі перапоўнены ўражаннямі, хоць ад'язджалі ад сталіцы зусім недалёка — ад 5 да 30 кіламетраў. Яно і не дзіўна, бо за дзень, паехаўшы супраць гадзіннікавай стрэлкі, мы зрабілі кола не толькі ў прасторы, але і ў часе. А колькі яшчэ неверагодна цікавых адкрыццяў можна зрабіць, вандруючы па роднай зямлі! Дарэчы, віртуальную вандроўку па самых адметных і прыгожых мясцінах нашай краіны цяпер можна ажыццявіць дзякуючы новаму праекту нашага выдавецкага дома на сайце zviazda.by.

**Дзіяна СЕРАДЗЮК.**
**Фота аўтара**

## Збег пад Прорвай

**Ва ўрочышчы Прорва паблізу Прыпяці работнікі Столінскай міжрайінспекцыі спынілі для праверкі легкавы аўтамабіль, у якім знайшлі тры сеткі даўжынёй 92 метры і азёрна-рачную рыбу — усяго 172 асобіны агульнай вагой 91 кілаграм.**

Пасля спынення легкавіка пасажыр не падпарадкаваўся дзяржінспектарам і збег. Зараз яго асоба ўстанаўліваецца. Шкода навакольнаму асяроддзю ад незаконнай здабычы рыбы ацэнена ў асабліва буйным памеры — 134 базавыя велічыні. Столінскі РАУС завёў крымінальную справу.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

**Управляющий в производстве по делу об экономической несостоятельности (банкротстве) ООО «Центр правовых услуг» поводит повторный открытый аукцион по продаже недвижимого имущества Общества с дополнительной ответственностью «КонсалтЛизинг»:**

| № лота | Наименование имущества | Ед. изм. | Кол-во | Начальная цена предмета торгов | Сумма шага аукциона в размере 5%, руб. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Изолированное помещение с инвентарным номером 100/D-73866 общей площадью 498,4 кв.м, расположенное по адресу: г. Брест, ул. Задворская, 4 | шт. | 1 | 1307596269 | 65379813 |
| | СТОИМОСТЬ 1 ЛОТА | | | 1307596269 | 65379813 |

Повторный аукцион состоится **24 сентября 2013 года в 10.00** по адресу: г. Брест, ул. Ясеневая, 20А, офис 203.

Заявления на участие в повторном аукционе с приложением копий свидетельств о государственной регистрации, доверенностей, выданных представителю (для юридических лиц и ИП), или копий паспортов (для физических лиц), заверенных банком документов, подтверждающих внесение суммы задатка на текущий (расчетный) банковский счет ОДО «КонсалтЛизинг», принимаются по **23 сентября 2013 года** до 17.00 по адресу: г. Брест, ул. Ясеневая, 20А, офис 203 или по факсу 80162-33-93-88.

Шаг аукциона равен пяти процентам от начальной цены имущества. Начальная цена установлена без НДС. Договор купли-продажи между Продавцом и Покупателем заключается в течение 7 (семи) дней с даты проведения торгов. Победитель аукциона обязан оплатить предмет торгов в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее тридцати дней со дня проведения торгов. Победитель аукциона возмещает расходы, связанные с проведением торгов в части оплаты объявления о проведении торгов, в течение 5 дней с даты проведения торгов.

Размер задатка для участия в аукционе составляет 10% от начальной цены имущества и перечисляется на расчетный счет ОДО «КонсалтЛизинг» № 3011356050012 в Региональной дирекции № 500 ЗАО «Банк ВТБ» (Беларусь), г. Брест, МФО 153001108, УНП 290307191 в срок до **23 сентября 2013 года** до 17 ч. 00 мин.

Победителем аукциона признается лицо, предложившее наиболее высокую цену за лот.

В случае, если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником, предмет торгов продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Результаты по проведению торгов оформляются протоколами.

Сведения об организаторе торгов: Общество с ограниченной ответственностью «Центр правовых услуг», юридический адрес: 224022, г. Брест, ул. Ясеневая, 20А, офис 203, контактные телефоны: 80162-33-93-88, 8029-802-80-00.

Сведения о продавце: Общество с дополнительной ответственностью «КонсалтЛизинг», юридический адрес: г. Брест, ул. Задворская, 4, контактные телефоны: 80162-33-93-88, 8029-802-80-00.

Организатор открытых торгов после опубликования извещения о проведении торгов вправе отказаться от их проведения при продаже имущества должника на аукционе – в любое время, но не позднее чем за пять дней до наступления даты его проведения.

Иную информацию о порядке и условиях проведения торгов, ознакомлении с предметом торгов можно получить в рабочие дни с 9.00 до 17.00 по адресу: 224022, г. Брест, ул. Ясеневая, 20А, офис 203, тел./факс 80162-33-93-88.

# СВЯТЫНІ, ЯКІЯ ЯДНАЮЦЬ



По традыцыі, усцілаючы кветкамі шлях, сустракалі вяскоўцы хрэсны ход з Дабрадатным агнём ад Гроба Гасподняга.

***За мінулыя дваццаць гадоў навукова-асветніцкая экспедыцыя прайшла і праехала амаль 25 тысяч кіламетраў. На гэтым шляху Дабрадатным агнём ад Гроба Гасподняга было асвечана каля 600 храмаў, манастыроў, капліц. У мерапрыемствах гэтай духоўна-асветніцкай місіі ўдзельнічалі 4,5 мільёна жыхароў гарадоў і вёсак.***

Гэты фотарэпартаж можна было пачынаць дваццаць гадоў таму, калі Беларусь упершыню адзначала сваё новае нацыянальнае свята пісьменства і друку. Тады быў зроблены першы запіс у дзённіку навукова-асветніцкай экспедыцыі «Дарога да святыняў» з Дабрадатным агнём. Менавіта ў той час былі выказаны першыя спадзяванні на адраджэнне гістарычнага Баркалабаўскага манастыра. Сёлета экспедыцыя зноў завітала на месца, дзе ўдзельнікі духоўнай місіі калісьці ўкапалі першы драўляны крыж. Цяпер на тым маляўнічым лузе ўжо выраслі першыя пабудовы Баркалабаўскага Узнясенскага жаночага манастыра. Такіх прыкладаў шмат. Духоўнае адраджэнне — галоўная мэта экспедыцыі. Яе галоўны стрыжань, які яднае людзей розных узростаў і поглядаў — нашы спадчынныя святыні.



Сярод тых, хто сустракаў экспедыцыю, было шмат школьнікаў.

Духоўна-асветніцкім напрамкам вызначаецца склад экспедыцыі. Яе ўдзельнікі — вядомыя беларускія навукоўцы, дзеячы літаратуры і мастацтва, святары, грамадскія дзеячы. Сёлета яны наведалі гарады і вёскі Мінскай, Брэсцкай, Магілёўскай абласцей, пабывалі ва ўстановах культуры і адукацыі, бальніцах, дзіцячых прытулках, удзельнічалі ў памінальных набажэнствах на месцах пахавання воінаў Вялікай Айчыннай вайны.

Як ва ўсе мінулыя гады, падчас сёлетняй экспедыцыі папаўняўся агульнабеларускі «Сад малітвы». Ва ўсіх населеных пунктах адбывалася пасадка дрэўцаў, якія будуць нагадваць пра наведванне гэтых мясцін паломнікамі з Дабрадатным агнём ад Гроба Гасподняга. Пад карэнне саджанцаў падсыпалася зямля з папярэдніх месцаў, дзе ўжо пабывала экспедыцыя. Такім чынам дубкі, яблынькі, бярозкі, клёны, вырастаючы з адзінай зямлі, нібы далучаюцца да нашай адзінай малітвы. Тысячы такіх дрэўцаў ужо растуць, набіраюць моцы каля храмаў, у школьных дварах, у скверах і на плошчах ва ўсіх абласцях рэспублікі.



Новы храм у горадзе Дрыбін. Тут адбыўся хрэсны ход і набажэнствы.



Паломнікі набліжаюцца да Святога поля пад Баранавічамі.



Прафесараў Сцяпана Лаўшука і Пятра Лысенку паўсюдна цікавілі вясковыя навіны.

Зразумела, што такі маштабны праект працягласцю ў дваццаць гадоў прыцягнуў да сябе знакавых асоб. Гэта яны на сустрэчах з вяскоўцамі і гараджанамі даносяць свае веды пра мінулае праваслаўнай царквы, пра першаасветнікаў, сусветна вядомых землякоў — навукоўцаў, пісьменнікаў, герояў-абаронцаў Айчыны. Дзякуючы экспедыцыі сотні тысяч слухачоў пачулі цікавыя выступленні кандыдата багаслоўя, прафесара, протаіерэя Сергія Гардуна; члена-карэспандэнта НАН Беларусі, доктара філалагічных навук, прафесара Сцяпана Лаўшука; археолага, доктара гістарычных навук, прафесара Пятра Лысенкі. Сотні тысяч гледачоў горача віталі народную артыстку Беларусі Марыю Захарэвіч, якая натхнёна чытала вершы Максіма Багдановіча, Янкі Купалы, урыўкі з прозы Якуба Коласа і многіх іншых зорак айчыннай літаратуры.

Нязменны кіраўнік і арганізатар экспедыцыі, заслужаны работнік культуры Рэспублікі Беларусь, лаўрэат прэміі «За духоўнае адраджэнне» пісьменніца Ніна Загорская падчас аднаго з выступаў сказала: «Сад нашай супольнай малітвы стаіць на мінулым і расце ў будучыню. Лісце з пасаджаных намі дрэў упадзе на далоні прапраўнукаў...»

**Яўген ПЯСЕЦКІ. Фота аўтара.**



Протаіерэй Сяргей Сень — адзін з тых святароў, чый прыход наведала экспедыцыя. Жыхары Дрыбіна назвалі яго Чалавекам года ў намінацыі «грамадска-палітычная дзейнасць». З яго ініцыятывы і пры непасрэдным удзеле было пабудавана шмат храмаў.



У гэтай лампадзе экспедыцыя пранесла Дабрадатны агонь, запалены каля Гроба Гасподняга ў Іерусаліме.



Народны майстар Елісей Саламянка з Баранавіч перадаў экспедыцыі драўляны макет царквы — скрыню для збору ахвяраванняў.

■ Ну і ну!

## «Мабільны талент»

**17-гадовы навучэнец аднаго са сталічных тэхнікумаў, раней судзімы за крадзеж, абхітрыў каля паўсотні людзей. Прычым, што цікава, не падлеткаў, а... дарослых. Ён знаходзіў даверлівых грамадзян, якіх пад рознымі прычынамі ўгаворваў аказаць яму дапамогу, аформіўшы на сябе набыццё дарагіх гаджэтаў.**

У асноўным ён дзейнічаў на тэрыторыі Цэнтральнага раёна сталіцы, дзе сканцэнтравана найбольшая колькасць салонаў сувязі. Атрыманыя падманным шляхам планшэты і дарагія мабільныя тэлефоны малады чалавек прадаваў на рынку ці праз інтэрнэт. Пацярпелыя даведваліся пра падман толькі тады, калі ім тэлефанавалі з паведамленнем аб пратэрміноўцы плацяжоў.

Займаўся навучэнец сваім «бізнесам» з мінулага года, прычым дзейнічаў рознымі шляхамі. Некаму абяцаў, што будзе плаціць самастойна, кагосьці проста падманваў, маўляў, на яго імя ўжо аформлены крэдыт і таму яшчэ адзін папросту не дадуць. Мог нават сказаць, што грошы ўносіць увогуле не трэба будзе, бо пры дапамозе «патрэбных сувязяў» звесткі пра кантракт з камп'ютарнай базы выдаляць. Дарэчы будзе сказаць, што большасць ашуканых грамадзян ішлі насустрач прадпрымальнаму маладому чалавеку не проста так, а за пэўны «ганарар» — 30-40 долараў. Гэты спосаб ён адшукаў у маі мінулага года на адным з сайтаў. У артыкуле навучэнец прачытаў, як лёгка зарабіць грошы, угаворваючы людзей за невялікае ўзнагароджанне браць на сябе крэдыты ці ў растэрміноўку — планшэты і мабільныя тэлефоны. На наступны ж дзень, скарыстаўшыся парадай, аферыст пазнаёміўся праз інтэрнэт з хлопцам, які дапамагаў яму шукаць людзей, што гатовыя былі за плату афармляць на сябе тыя самыя крэдыты ці браць у растэрміноўку дарагі тавар і перадаваць яго «заказчыку» паслугі. Як высветлілася, ахвотнікаў зарабіць грошай «па-лёгкаму» аказалася больш чым дастаткова. Агулам ахвярамі махляра сталі 48 чалавек, у дачыненні да прадпрымальнага навучэнца заведзена больш за 50 крымінальных спраў.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

IIHF 2014 WORLD CHAMPIONSHIP BELARUS Minsk

## ЧЭМПІЯНАТ СВЕТУ ПА ХАКЕІ РАСПАЧНУЦЬ БЕЛАРУСЫ І АМЕРЫКАНЦЫ



**Стаў вядомы расклад чэмпіянату свету па хакеі, які пройдзе ў Мінску з 9 па 25 мая 2014 года. Стартавы матч сусветнага форуму мусіць сабраць усе 15 тысяч заўзятараў, на якія разлічана «Мінск-Арэна». Бо адкрываць праграму спаборніцтваў будуць зборныя Беларусі і ЗША. У гэты ж дзень згуляюць яшчэ дзве вельмі моцныя каманды — швейцарцы і расіяне.**

9 мая распачнуцца і першыя матчы на «Чыжоўка-Арэне», якая, дарэчы, адчыніцца літаральна праз два месяцы. На новай пляцоўцы ў першы дзень чэмпіянату адбудуцца матчы Францыя — Канада і Славакія — Чэхія. А вось дзейныя чэмпіёны планеты — зборная Швецыі — абарону тытула пачне на наступны дзень гульнёй супраць Даніі.

Адзначым, што ўсе сустрэчы на групавой стадыі і чвэрцьфіналы пройдуць на дзвюх арэнах (гульні ў групе B — на «Мінск-Арэне», матчы групы A — на «Чыжоўка-Арэне». — **Аўт.**), а за паўфіналамі і фіналам гледачы змогуць назіраць ужо ў адным месцы — з трыбун галоўнай хакейнай пляцоўкі краіны.

Продаж квіткоў на матчы пачнецца ў канцы верасня. Каб наведаць адзін матч групавой стадыі, трэба будзе заплаціць ад 6 да 50 еўра. А вось кошт квіткоў на гульні фінальнага раўнда будзе пачынацца ад 25 еўра. Таксама ў продаж запусцяць білетныя пакеты на гульнявы дзень, на матчы групавой стадыі, на сустрэчы фінальнага раўнда, на ўсе гульні ў межах адной з арэн, а таксама пакеты разам з пражываннем, харчаваннем, экскурсіямі і іншымі паслугамі.

| Группа А | Группа В |
|---|---|
| Швецыя | Фінляндыя |
| Чэхія | Расія |
| Канада | ЗША |
| Славакія | Швейцарыя |
| Нарвегія | Германія |
| Данія | Латвія |
| Францыя | **БЕЛАРУСЬ** |
| Італія | Казахстан |

## «ТУЗ У РУКАВЕ» ВІКТОРЫІ АЗАРАНКІ



Фота БЕЛТА.

**Вікторыя Азаранка працягвае выступленне на Адкрытым першынстве ЗША па тэнісе. У чвэрцьфінальным матчы беларуска ўпэўнена «разабралася» са славацкай тэнісісткай Даніэлай Хантухавай — 6:2, 6:3 і выйшла ў паўфінал.**

Наступнай саперніцай другой ракеткі свету будзе італьянка Флавія Пенета, якую можна лічыць галоўным «чорцікам з табакеркі» гэтага турніру. Перад пачаткам спаборніцтваў колішняя 10-я ракетка свету займала толькі 83-і радок рэйтынгу. Але гэта можна патлумачыць: італьянская тэнісістка прапусціла канцоўку леташняга сезона з-за аперацыі на запясці і толькі ў пачатку вясны ўзнавіла выступленні. Парадаксальна, але ў такіх умовах Флавія Пенета паказала лепшы вынік у кар'еры на турнірах Вялікага шлема.

Дарэчы, у кампаніі паўфіналістак наша суайчынніца — самая маладая. Вікторыя маладзейшая за сваіх апанентак на 7 гадоў. Амерыканка Серэна Уільямс, кітаянка На Лі, як і Флавія Пенета, даўно размянялі трэці дзясятак. Ці з'яўляецца ўзрост «тузом у рукаве» для беларускі, адназначна адказаць складана. Па фізічнай падрыхтоўцы ўсе тры саперніцы Вікторыі могуць даць фору любой маладой тэнісістцы. А вось ці не адчуваюць дадатковага прэсінгу з-за гэтага факта вялікаўзроставыя паўфіналісткі — пытанне адкрытае. Нездарма псіхалогія ў жаночым тэнісе часта выходзіць на першы план.

У любым выпадку развязкі турнірных калізій доўга чакаць не прыйдзецца. Паўфінальныя матчы адбудуцца ўжо сёння, а фінальную гульню пабачым заўтра.

**Дарына ЗАПОЛЬСКАЯ.**

Даты | Падзеі | Людзі

**1812** год — Напалеон, узяўшы Шавардзінскі рэдут і ведаючы, што руская армія заняла пазіцыі каля вёскі Барадзіно, бітвы не пачынае. «Воіны! Вось бітва, якой вы так чакалі. Перамога залежыць ад вас!» — не без пафасу заявіў ён войскам. Міхаіл Кутузаў таксама аб'ехаў войскі, але задачу на заўтра выклаў без патэтыкі: «Кожны полк будзе выкарыстаны па справе. Вас будуць мяняць, як вартавых, кожныя дзве гадзіны. Спадзяюся на вас. Бог нам дапаможа...».

**1907** год — нарадзіўся (мястэчка Церахоўка, цяпер Добрушскі раён Гомельскай вобласці) Леанід Рыгоравіч Рахленка, беларускі рэжысёр і акцёр, народны артыст Беларусі (1946) і СССР (1966). У 1929-81 гадах працаваў у Беларускім тэатры імя Янкі Купалы (у 1937-43-м — мастацкі кіраўнік). Сярод роляў: Гарлахвацкі («Хто смяецца апошнім» К. Крапівы), Сымон («Салавей» З. Бядулі), Бубноў («На дне» М. Горкага) і іншыя. Здымаўся ў кінафільмах «Міколка-паравоз», «Палеская легенда», «Гадзіннік спыніўся апоўначы», «Веснавыя навальніцы». Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1970).



**1936** год — нарадзіўся (вёска Баяры, цяпер Карэліцкі раён Гродзенскай вобласці) Фёдар Уладзіміравіч Мірачыцкі, вядомы беларускі вучоны ў галіне заатэхніі і эканомікі сельскай гаспадаркі, член-карэспандэнт Акадэміі аграрных навук Беларусі (1992), заслужаны работнік сельскай гаспадаркі Беларусі (1983). У 1969-94 гадах — намеснік, першы намеснік міністра сельскай гаспадаркі, намеснік старшыні Дзяржплана, першы намеснік старшыні Дзяржаграпрама, міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Беларусі. Аўтар навуковых прац па кормавытворчасці, свінагадоўлі, малочнай жывёлагадоўлі, эканоміцы і арганізацыі сельскагаспадарчай вытворчасці.

Было сказана

**Аляксандр ЕЛЬСКІ, пісьменнік, этнограф, гісторык, перакладчык, публіцыст:**

*«Родная мова ў дакладным значэнні ёсць самая любімая спадчына нацыі; праз яе пасярэдніцтва лягчэй за ўсё пранікнуць у душу нацыі, закрануць пачуцці, праясніць розум, падштурхнуць адпаведную думку, заклікаць да дзеяння, змагацца са страсцямі, ствараць дабрачыннасці!».*




## СЁННЯ

| Сонца | | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|---|
| Мінск | — | 6.26 | 19.48 | 13.22 |
| Віцебск | — | 6.14 | 19.40 | 13.26 |
| Магілёў | — | 6.17 | 19.38 | 13.21 |
| Гомель | — | 6.15 | 19.33 | 13.18 |
| Гродна | — | 6.42 | 20.03 | 13.21 |
| Брэст | — | 6.45 | 20.01 | 13.16 |

### Месяц

***Маладзік 5 верасня. Месяц у сузор'і Шаляў.***

### Імяніны

***Пр.** Арсенія, Георгія, Пятра.*
***К.** Беаты, Яўгеніі, Захара, Германа, Магнуса, Міхала, Яўгена.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

Ідзе экзамен па правілах дарожнага руху. Экзаменатар:

— Скрыжаванне, тут вы, тут аўтобус, тут грузавік, тут матацыкл. Хто праедзе першы?

Курсант:

— Таксіст.

Экзаменатар:

— Чаму таксіст?! Адкуль там узяўся таксіст?!

Курсант:

— Ды чорт яго ведае, адкуль гэтыя таксісты бяруцца...

**Уражанні пасля адпачынку.**

**Гатэль спадабаўся, нумар наогул супер, а ручнікі такія пухнатыя, што ледзь чамадан закрыў.**




caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. КАРПЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), В. КЛЮЧНІК (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (першы намеснік дырэктара—галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

НАШ АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 23.238. Індэкс 63850. Зак. № 3874.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 5 верасня 2013 года.